КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 46 (222) ◂ 17 снежня ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



## СУСТРЭНЕМСЯ НА ПЛОШЧЫ?

Стар. 3

## ХЛУСНІ Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ СТАЛА ЗАМНОГА

Агітацыйная кампанія кандыдатаў у прэзідэнты розніцца найперш доступам да рэсурсаў — чалавечых і матэрыяльных

Стар. 4

## БЯЖЫ, КУБІНЕЦ, БЯЖЫ!

Колькасць кубінскіх спартсменаў, якія бягуць у ЗША, расце ў геаметрычнай прагрэсіі. У Гаване рыхтуюць рэформу спартовай сістэмы

Стар. 12

## СОНЕЧКА Ў СТУПАРЫ

Стар. 14

ISSN 2218-2144

ЧЫТАЙЦЕ
Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

## ЗААКІЯНСКІ ВЫРАЙ

Нарыс Марыі Мартысевіч

▸ АД РЭДАКТАРА

# БЕЛАРУСКІЯ ВЫБАРЫ ПАМІЖ ЗАХАДАМ І ЎСХОДАМ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Асаблівасці прэзідэнцкіх выбараў–2010 толькі падкрэсліваюць яе тыповасць як мадэлі аўтарытарных і таталітарных палітычных сістэм. З найбольшай рэльефнасцю гэтыя асаблівасці высвечваюць уплыў знешняга фактара, скіраванага ці на падтрымку такіх рэжымаў, ці на іх дэмантаж. У нас скрыжаваліся абедзве тэндэнцыі.**




### Калідор пагроз

Гітлераўская таталітарная сістэма пацярпела крах пасля паразы ў гарачай вайне. Савецкая — пасля паразы ў вайне халоднай. І менавіта на сколку савецкай сістэмы аднавілася беларуская мадэль аўтарытарызму (вертыкаль). Не без дапамогі новай-старой расійскай кіроўнай эліты.

Заходняга ўплыву падчас першай постсавецкай хвалі дэмакратызацыі не хапіла, каб пераадолець геапалітычную перавагу расійскага ўплыву.

Але, як гэта ні парадаксальна, абодва цэнтры ўплыву не адразу ўсвядомілі ўвесь маштаб новай геапалітычнай вагі Беларусі ў яе новай якасці — суверэннай незалежнай дзяржавы. Брусэль не заўважыў небяспекі «апошняй дыктатуры ў Еўропе» для ўстойлівасці ўсёй еўрапейскай дэмакратычнай канструкцыі. Масква — памкненняў новага беларускага ўладара не толькі пазбавіцца ад васальнай залежнасці, але і праравацца на крамлёўскі пасад.

Гэта неразуменне і стварыла для А. Лукашэнкі калідор магчымасцей для манеўра, для інтрыгі, для бясконцых клятваў у дружбе — у адзін бок, варожых выпадаў — у другі. Да заклікаў аб стварэнні саюзнай з Расіяй дзяржавы і рэальным курсам на самаізаляцыю ад Захаду. Для лавіравання паміж імі. І на тым пратрымацца 16 гадоў з пралангацыяй на пажыццёвае ўладарства.

Адсюль і перамены знешнепалітычнага курса як з боку Захаду, так і з боку Расіі, хаця і з супрацьлеглым зместам: Захаду — ад палітыкі ізаляцыі да дыялога, Расіі — ад палітыкі братэрства і эканамічных прэферэнцый да нафтагазавых і інфармацыйных войнаў. І з рознымі мэтамі. Захаду патрэбна дэмакратызацыя Беларусі, што ўжо само па сабе з’явілася б гарантыяй стабільнасці ў цэнтры Еўропы. Расіі ж Беларусь патрэбная як абсалютны яе палітычны сатэліт дзеля ажыццяўлення ўласных вялікадзяржаўных планаў. Аднак часова глабальны фінансавы крызіс прымусіў і Захад, і Усход перааацаніць эканамічныя выгоды ад супрацоўніцтва з Беларуссю. Аднак пры гэтым ва ўзмацненні геапалітычнай вагі Расіі, у тым ліку і за кошт поўнага падпарадкавання свайму ўплыву Беларусі, Захад адчуў для сябе небяспеку.

Так Беларусь, ці не ўпершыню пасля трох тэрытарыяльных падзелаў канца XVIII стагоддзя, аказалася ў цэнтры глабальнай палітычнай гульні.

### Сігналы слабасці

А тут наспелі і прэзідэнцкія выбары. Пры ўсім тым абодва цэнтры ўплыву вымушаны ўлічваць сітуацыю ўнутры краіны, рэагаваць на падзеі і сігналы, якія сыходзяць з Беларусі. Не тое стагоддзе на двары, каб адкрыта дыктаваць сваю волю сілай. Нават для аўтарытарнай Расіі. Для дэмакратычнага ж Захаду сілавы варыянт наогул выключаны.

Безумоўна, асноўнымі імпульсамі, на якія мусіць рэагаваць і Захад, і Усход, з’яўляюцца імпульсы з уладных структур. Але і сігналы ад апазіцыі, хаця і аслабленай рэпрэсіямі, нечага вартыя.

Усім ужо зразумела, што беларуская мадэль выбараў ёсць цалкам імітацыйная мадэль, прызначэнне якой — надаць выгляд законнасці аднаасобнаму ўладару. Гэта не выбары прэзідэнта Беларусі, а, паводле з’едлівага сучаснага фальклору, выбары Лукашэнкі Беларусі.

Але менавіта дзеля прызнання найперш Захадам сваёй улады легітымнасці, і выключна пад уплывам Захаду, А. Лукашэнка і пайшоў на касметычную лібералізацыю выбарчай сістэмы.

Калі выбары не выбары, а палітычная барацьба, то натуральна, што і беларускае грамадства, і Захад чакалі ад апазіцыі высілкаў да кансалідацыі, да вылучэння адзінага кандыдата. Менавіта гэта выразна вызначыла водападзел і зрабіла б зразумелым для насельніцтва сэнс і мэты палітычнага супрацьстаяння.

Усю небяспеку для сябе пры такім развароце падзей добра зразумела ўлада і дала зялёнае святло на рэгістрацыю ўсіх 9 кандыдатаў, растварыўшы такім чынам іх імёны ў агульным катле.

Не варта папракаць апазіцыю за слабасць. Але варта крытыкаваць за тое, што яна магла зрабіць, аднак не зрабіла. Трапіла ў пастку амбіцый лідараў. Не здолела выпрацаваць імунітэт супраць бацылаў аўтарытарызму, вірусаў варожасці і хлусні, звадак і расколаў ва ўласным асяродку.

У грамадстве, наскрозь пранізаным ілжой аўтарытарнага рэжыму, адзінай моцнай зброяй апазіцыі ёсць маральнасць, шчырасць памкненняў, праўда ў слове і паводзінах.

Працяг на стар. 4 ▸

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## «ЗА СВАБОДУ» — ЗА НАЗІРАННЕ

Генадзь КЕСНЕР

**Рух «За Свабоду» 19 снежня накіруе на выбарчыя ўчасткі больш за 600 сваіх назіральнікаў. Удзельнічаць у назіранні падчас датэрміновага галасавання гэта грамадскае аб'яднанне лічыць бессэнсоўным, бо назіральнікам забаронена знаходзіцца каля скрыняў для галасавання кругласутачна.**

Як распавёў журналістам 15 снежня намеснік старшыні руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч, магчымасць і правы весці назіранне за мясцовымі, парламенцкімі і прэзідэнцкімі выбарамі замацавана ў Статуце гэтага грамадскага аб'яднання. Вылучэнне назіральнікаў адбылося на пасяджэнні рады арганізацыі 8 снежня.

«Мы разгледзелі спіс прадстаўнікоў аб'яднання і зацвердзілі 634 чалавекі ў якасці назіральніка. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, мы маем правы вылучаць па аднаму прадстаўніку на ўчастак, гэта азначае, што мы базава ахопліваем 634 участкі, — адзначыў каардынатар кампаніі руху «За Свабоду» па назіранню за выбарамі. — Ужо пасля пасяджэння да нас звярталіся людзі, якія таксама жадалі стаць назіральнікамі, але цяпер у іх засталася толькі магчымасць сабраць дзесяць подпісаў грамадзян і зарэгістравацца менавіта такім чынам. Так што колькасць участкаў, на якіх будуць нашы назіральнікі, будзе крыху большай».

Па словах Юрася Губарэвіча, рух «За Свабоду» таксама накіруе сваіх назіральнікаў на дзевяць выбарчых участкаў, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі. Так, сябры арганізацыі будуць сачыць з выбарамі прэзідэнта ў Боне, Берліне, Празе, Вашынгтоне, Будапешце, Вільнюсе, Рыме, Варшаве і Маскве. Вынікі назірання як у Беларусі, так і ў замежжы міркуецца выстаўляць у рэжыме on-line на спецыяльна створаным дзеля гэтага сайце рух.by.

Юрась Губарэвіч заявіў, што рух «За Свабоду» не будзе спецыяльна назіраць за датэрміновым галасаваннем. Паводле слоў палітыка, паколькі Цэнтральная камісія забараніла назіральнікам кругласутачна знаходзіцца на ўчастках для датэрміновага галасавання, то адсачыць верагодныя фальсіфікацыі будзе практычна немагчыма. Але дзясяткі прадстаўнікоў руху ўсё ж будуць адсочваць і колькасць выбарцаў, якія прыйшлі галасаваць датэрмінова.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЗАЯВА МАЙКЛА СКЭНЛАНА

**Часовы паверавы ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан прадставіў беларускім журналістам новага першага сакратара амбасады — Крыстафера Паніку. У кола абавязкаў дыпламата ўваходзяць у тым ліку і сувязі са СМІ.**

Беларусь для Крыстафера Панікі знаёмая краіна: дзесяць гадоў таму ён ужо працаваў у амбасадзе ЗША. Вяртанне дыпламата, які ведае Беларусь, можна лічыць знакам увагі амерыканскага знешнепалітычнага ведамства да нашай краіны.

Прадстаўляючы Крыстафера Паніку, спадар Скэнлан нагадаў сітуацыю 2008 года, калі па рашэнні беларускіх уладаў Беларусь вымушаны былі пакінуць амерыканскія дыпламаты, абвешчаныя персонамі нон-грата. У складзе амерыканскай дыпламатычнай місіі засталося працаваць усяго толькі 5 чалавек. Сітуацыя з таго часу не змянілася.

Адначасова кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва скарыстаўся нагодай, каб зрабіць заяву, прысвечаную двум асноўным пытанням: рашэнню беларускага ўрада адмовіцца ад высокаўзбагачанага ўрану і хадзе выбарчай кампаніі.

Скэнлан падкрэсліў, што ЗША высока ацэньваюць рашэнне беларускага ўрада адмовіцца ад высокаўзбагачанага ўрану і яго замены на абеднены ўран. «ЗША, — удакладніў ён, — узялі на сябе абавязацельства аказваць гэтаму працэсу фінансавую падтрымку, а таксама любую тэхнічную дапамогу, якая можа спатрэбіцца».

Майкл Скэнлан пацвердзіў, што пазіцыя ЗША адносна Беларусі ёсць і застанецца нязменнай і паслядоўнай: ЗША і надалей выступаюць за тое, каб афіцыйны Мінск прытрымліваўся дэмакратычных стандартаў.

У шэрагу пазітыўных змен Майкл Скэнлан назваў больш адкрытыя магчымасці для збору подпісаў і рэгістрацыі кандыдатаў, для арганізацыі іх сустрэч з выбарцамі. Разам з тым, абапіраючыся на справаздачы назіральнікаў АБСЕ, адзначыў занадта вялікую ролю дзейнага прэзідэнта ў фармаванні выбарчых камісіяў, недастаткова празрыстыя працэдуры іх стварэння, малую прысутнасць у камісіях прадстаўнікоў апазіцыі — меней за 1 працэнт ад іх складу.

Спадар Скэнлан зазначыў, што самае важнае ў выбарчым працэсе тое, што грамадзяне павінны быць добра інфармаванымі, каб мець магчымасць зрабіць выбар. «Мы верым, — падкрэсліў кіраўнік амерыканскай дыпламатычнай місіі, — у важнасць легітымнасці самога працэсу выбараў, бо яна надае легітымнасць любому, хто б ні выйграў іх».

Скэнлан выказаў спадзяванне, што падлік галасоў 19 снежня будзе арганізаваны такім чынам, каб усе сябры камісій і назіральнікі маглі бачыць кожны бюлетэнь, а кандыдаты і іх прыхільнікі ў ноч пасля выбараў маглі б сабрацца разам і дачакацца вынікаў. Так, як гэта робіцца ў ЗША, у Еўропе, у іншых краінах свету.

МАНІТОРЫНГ

## РОЎНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ НЕ БЫЛО

Генадзь КЕСНЕР

**Служба маніторынгу ГА БАЖ 14 лістапада прэзентавала чарговую частку агляду «Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў 2010 года ў беларускіх СМІ». Назіранне вялося за 18 дзяржаўнымі і незалежнымі медыямі з 21 лістапада да 10 снежня.**

Як адзначыў кіраўнік службы маніторынгу БАЖ Алесь Анціпенка, гэта быў самы актыўны перыяд выбарчай кампаніі, у які кандыдаты ў прэзідэнты праз газеты, радыё і тэлебачанне змаглі звярнуцца да выбаршчыкаў са сваімі праграмамі.

У параўнанні з папярэднімі выбарчымі кампаніямі, умовы доступу кандыдатаў у прэзідэнты да дзяржаўных СМІ палепшыліся. Напрыклад, прэтэндэнты атрымалі магчымасць выступіць у прамым эфіры, час іх выступаў па тэлебачанню быў пасунуты да прайм-тайму, а выступы адбываліся на Першым нацыянальным канале Беларускага тэлебачання.

Алесь Анціпенка, адзначыў, што ў другі раз пасля 1994 года адбыліся таксама і тэлерэбаты. «Іх, аднак, нельга лічыць паўнавартаснымі, бо галоўны апанент альтэрнатыўных кандыдатаў, дзеючы прэзідэнт, адмовіўся ад удзелу ў іх», — лічыць эксперт.

Як бачна з вынікаў гэтай часткі маніторынгу, нягледзячы на тое, што ў дзяржаўных мас-медыя, параўнальна з папярэднімі электаральнымі кампаніямі, палепшыліся ўмовы прамога доступу да іх кандыдатаў, асноўная схема асвятлення выбарчага працэсу засталася нязменнай.

А гэта азначае: факусаванне ўвагі на адным кандыдаце — дзеючым прэзідэнце краіны; рэпрэзентацыя ў якасці галоўных асобаў выбарчага працэсу суб'ектаў, роля якіх (напрыклад, рэгіянальных камісій ці мясцовых уладаў) галоўным чынам тэхнічная; маргіналізацыя апазіцыйных кандыдатаў, іх дзейнасці, гэтак жа сама як і дзейнасці апазіцыйных партый коштам як адмоўных ацэнак, так і наўмыснай мінімалізацыі іх прысутнасці ў дзяржаўных СМІ; стварэнне на фоне неадпаведнай рэпрэзентацыі альтэрнатыўных кандыдатаў эфекту адсутнасці выбару ці, больш дакладна, эфекту выбару на карысць аднаго кандыдата.

Апроч таго, паведамляючы пра дадзеныя розных сацыялагічных апытанняў, часта без указання, хто іх праводзіў, тыя ж самыя СМІ ствараюць эфект перадвызначанасці вынікаў галасавання. Нарэшце, замест падачы розных меркаванняў выбаршчыкаў прысутнічае выразная тэндэнцыя аднабаковага асвятлення выбарчага працэсу праз дыскрэдытацыю альтэрнатыўных кандыдатаў і станоўчую ці надзвычай станоўчую рэпрэзентацыю дзеючага прэзідэнта.

«Што да недзяржаўнай прэсы, то яна, як і раней, стварала шырокую карціну выбарчага працэсу, а кандыдаты на пасаду прэзідэнта заставаліся яе галоўнымі дзеючымі асобамі, — адзначае Алесь Анціпенка.

ГАЛАСАВАННЕ

## РЭКОРДНЫЯ ТЭМПЫ

Генадзь КЕСНЕР

**Калі датэрміновае галасаванне будзе праходзіць такімі тэмпамі, як першыя два дні, то ў Беларусі будзе пабіты рэкорд яўкі да асноўнага дня выбараў.**

Пра гэта 16 снежня на прэсканферэнцыі казалі каардынатары кампаніі «За справядлівыя выбары».

За першыя два дні на выбарчыя ўчасткі прыйшлі 7,2% выбаршчыкаў, што ў 1,2 разы больш параўнальна з аналагічным перыядам на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года. «Калі так пойдзе і далей, то да 19 снежня датэрмінова могуць прагаласаваць 38–40% грамадзян, якія маюць права голасу», — адзначыў старшыня Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін.

Улады, падкрэсліў палітык, актыўна выкарыстоўваюць адміністрацыйны рэсурс: кампанія мае звесткі, што кіраўнікі ВНУ, а таксама дэканы і іх намеснікі, напрыклад, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (БНТУ) пагражаюць студэнтам у выпадку адмовы прагаласаваць датэрмінова высяленнем з інтэрнатаў, праблемамі падчас сесіі і нават адлічэннем.

На ВА «Хімвалакно» кіраўніцтва палохае працоўных тэрактамі, якія нібыта рыхтуе апазіцыя ў дзень асноўнага галасавання, і, каб застацца ў жывых ці не пацярпець у выніку такіх дзеянняў працоўніках улады, заклікае сваіх падначаленых прагаласаваць загадзя.

Ужо ёсць і выпадкі істотных разыходжанняў паміж дадзенымі незалежных назіральнікаў і ўчастковых камісій па колькасці прагаласаваўшых датэрмінова: на адным з участкаў назіральнікі налічылі 77 чалавек, што ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, а камісія паведаміла пра 113 прагаласаваўшых.

Намеснік старшыні руху «За Свабоду» Віктар Карняенка распавёў, што з першага дня сябры кампаніі «За справядлівыя выбары» не маюць магчымасці пасылаць і атрымліваць СМС-паведамленні. Аператар мабільнай сувязі адказаў, што не можа разблакаваць СМС-сувязь і не ведае, што насамрэч здарылася.

Сяргей Калякін адзначыў, што толькі сябры гэтай кампаніі накіравалі 47 скаргаў на парушэнні заканадаўства падчас датэрміновага галасавання. «Таму сакратар Цэнтрвыбаркаму Лазавік нахабна хлусіць, калі кажа ў дзяржаўных СМІ, што выбаркамы не атрымліваюць ніякіх скаргаў на парушэнні выбарчага заканадаўства», — заявіў лідар «Справядлівага свету».

ВЫБАРЫ

## ВОЗЬМУЦЬ КОЛЬКАСЦЮ

Вольга ХВОІН

**За хадой прэзідэнцкіх выбараў сочаць больш за 28 тысяч назіральнікаў як з Беларусі, так і з-за яе межаў.**

Цэнтрвыбаркам акрэдытаваў на прэзідэнцкія выбары 1015 міжнародных назіральнікаў. Амаль палова з іх — 406 чалавек — гэта прадстаўнікі місіі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правам чалавека (БДІПЧ) АБСЕ. Таксама ў краіне цяпер знаходзяцца прадстаўнікі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, дыпламатычных і консульскіх устаноў, парламентарыі замежных краін.

У выбарчых камісіях працуюць больш за 27 тысяч унутраных назіральнікаў. Найбольш назіральнікаў вылучылі такія грамадскія аб'яднанні, як Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, РГА «Белая Русь», Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў. Будуць назіральнікі, вылучаныя шляхам падачы заяў, ад працоўных калектываў, ад палітычных партый.

Маштабную кампанію па назіранню за выбарамі ладзяць беларускія праваабаронцы. Ад іх працуюць 600 кароткатэрміновых і 80 доўгатэрміновых назіральнікаў, яны вядуць штодзённае назіранне за ходам датэрміновага галасавання на 300 выбарчых участках па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Справаздачы з выбарчых участкаў штодзённа апрацоўваюцца і з'яўляюцца рэпрэзентатыўнымі (назіраннем ахоплена 4,7% ад 6 346 выбарчых участкаў на тэрыторыі краіны), г. зн. дазваляюць ацаніць агульныя тэндэнцыі датэрміновага галасавання ў Беларусі.

Назіранне арганізавалі і сіламі руху «За Свабоду» — 634 чалавекі былі зацверджаныя на пасяджэнні Рады арганізацыі.

Прэзідэнцкія выбары цікавяць і СМІ. Цяпер у Беларусі працуюць больш за 600 журналістаў замежных СМІ. На выбарах 2006 года было акрэдытавана 550 замежных журналістаў.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СУСТРЭНЕМСЯ НА ПЛОШЧЫ?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**«Нас пужаюць, а мы не баімся», — гэта дэвіз сённяшняй перадвыбарчай кампаніі. Пасля таго, як шэрагу кандыдатаў у прэзідэнты было вынесена папярэджанне Генпракуратуры за заклікі выйсці на Кастрычніцкую плошчу Мінска 19 снежня, кандыдаты ў прэзідэнты не толькі не спынілі свае заклікі. Здаецца, яны папросту раззлаваліся.**

Кандыдат у прэзідэнты ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук наўпрост заявіў, што Плошча — частка ягонай перадвыбарчай праграмы, і адмаўляцца ён ад яе не мае намеру. Больш за тое, непітушчы Раманчук паабяцаў, што вып'е бутэльку віна «з гарла» ў апошні дзень прэзідэнцтва Лукашэнкі.

Гэта ён заявіў на сустрэчы каля Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта і паўтарыў у наўпроставых дэбатах на партале TUT.BY. Праўда, каля ўніверсітэта Раманчук папрасіў падтрымаць яго лідэра АГП Анатоля Лябедзьку — бо сам Раманчук не ведае, што з ім здарыцца пасля такога «подзвігу». А падчас дэбатаў на партале TUT.BY папрасіў парады, што выпіць, у Мікалая Статкевіча, які ў той жа час заявіў, што ён аматар добрых вінаў.

Здаецца, алкагалізацыя Раманчука сур'ёзна занепакоіла беларускія ўлады. Увечары 11 снежня ў эфіры тэлеканалу «РТР-Беларусь» кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей паведаміў пра правакацыі, якія нібыта рыхтуюцца на дзень выбараў. Паводле ягоных словаў, апазіцыйныя кандыдаты на прэзідэнта рыхтуюць 19 снежня на Кастрычніцкай плошчы Мінска правакацыі з ужываннем выбуховых рэчываў.

«Ужо вядома, што яны не збіраюцца мірна праводзіць гэта мерапрыемства. Рыхтуюцца групы баевікоў, закупляюцца цёплыя рэчы, піратэхнічныя і нават выбуховыя рэчывы», — заявіў Макей.

Гэтую заяву Макея кандыдат у прэзідэнты Мікола Статкевіч расцэньвае як «спробу запалохаць людзей». На думку палітыка, такія заявы сведчаць пра слабасць улады. «У 2006 годзе тагачасны кіраўнік КДБ Сцяпан Сухарэнка запалохваў людзей нейкімі дохлымі пацукамі, якіх мы так і не ўбачылі. Цяпер Макей палохае людзей баевікамі і зброяй», — сказаў Статкевіч.

Названыя заявы Статкевіч расцэньвае як гарантыю таго, што акцыя 19 снежня на Кастрычніцкай плошчы пройдзе мірна. «Яны не будуць прымяняць сілу. Інакш усё тое, што яны казалі, перакладзецца на іх», — лічыць палітык.

Кандыдат Уладзімер Някляеў у сваю чаргу заявіў: «Калі сёння нехта рыхтуе тэракт, дык хіба што ўлада. Сама рыхтуе, сама папярэджвае — чытай, пагражае. А кандыдатам ад апазіцыі ёсць чым заняцца: час агітацыі ў нашай краіне кароткі, і ўсе імкнуцца атрымаць ад яго максімальны эфект. У тым ліку распавесці пра тое, што выхад на плошчу будзе насіць выключна мірны характар».

Больш за тое, Міністэрства юстыцыі Беларусі выступіла з заявай, у якой заклікае кіраўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў не здзяйсняць супрацьзаконных дзеянняў у дзень выбараў.

«Міністэрства юстыцыі як орган, які рэгіструе інстытуты грамадзянскай супольнасці, заклікала кіраўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, прафсаюзаў і палітычных партый выконваць дзеючае заканадаўства і не дазволіць уцягнуць сябе і свае арганізацыі ў палітычныя гульні, якія ладзяць пэўныя асобы, што заклікаюць у дзень выбараў да супрацьзаконных дзеянняў, якія могуць парушыць правы і законныя інтарэсы іншых грамадзян», — гаворыцца ў заяве Мінюста, распаўсюджанай 15 снежня.

Дзякуй Богу, наш Мінюст не знаходзіцца на тэрыторыі Украіны. Інакш трэба было б супрацоўнікаў Мінюста адпайваць валяр'янкай ці чымсьці мацнейшым. Можа, настойкай баярышніку. А можа, увогуле выклікаць «хуткую дапамогу».

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ўкраінская феміністкая ініцыятыва FEMEN вырашыла «падтрымаць братэрскі народ, змучаны таталітарным рэжымам кіравання Лукашэнкі». FEMEN правялі манамітынг «Турніце бацьку!» каля сценаў амбасады Беларусі ў Кіеве. Другім пасланнем акцыі было «Шукайце Алесю!» — як заклік уводзіць у палітыку жанчын. Адна дзяўчына выйшла да беларускай амбасады. Распранулася топлес і трымала лозунгі з заклікам скінуць «бацьку». «Мы лічым, што выратаваць Беларусь сёння можа толькі жанчына. FEMEN прапаноўвае беларусам супрацьпаставіць мужчынскаму нахабнаму таталітарызму жаночую мяккасць і сілу. «Chercher la femme, браты славяне!» — адзначаецца ў блогу FEMEN у Жывым журнале.

Шкада, што нельга паставіць у газету фотаздымкі з гэтай акцыі. Бо будзе прыроўнена да прапаганды парнаграфіі. Надта ж прывабная там дзяўчына.

Тым не менш, у Беларусі пачалося датэрміновае галасаванне. У першы дзень датэрміновага галасавання на выбарах прэзідэнта Беларусі прагаласавала 3,4 працэнта выбарцаў. «Датэрміноўка» ідзе з апераджэннем графіку 2006 года.

«У цэлым па рэспубліцы за ўчорашні дзень прагаласавала 3,4% выбарцаў, унесеных у спісы для галасавання», — адзначыў сакратар беларускага ЦВК Мікалай Лазавік.

«У час вучобы, якую мы праводзілі ў абласцях, прасілі не фарсіраваць датэрміновае галасаванне, асабліва ў сельскай мясцовасці», — сказаў сакратар ЦВК. Паводле ягоных слоў, «цяпер, размаўляючы з арганізатарамі выбараў і пытаючыся, як паводзіць сябе насельніцтва, атрымліваем нечаканы адказ. Наадварот, самі сельскія жыхары актыўна ідуць на датэрміновае галасаванне», — адзначыў Лазавік.

Сакратар заявіў, што ў ЦВК не паступала «ніводнага сігналу» з нагоды прымусу да датэрміновага галасавання або нейкіх збояў у працы выбарчых камісій.

У 2006 годзе, паводле паведамленняў з Цэнтравыбаркаму, у першы дзень да скрыняў прыйшлі 3% ад агульнай колькасці выбарцаў. Усяго ў 2006 годзе датэрмінова прагаласавала 31,3 працэнта выбарцаў. Здаецца, зараз гэты рэкорд будзе перакрыты.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР МАКЕЙ



Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта ў эфіры тэлеканала РТР-Беларусь вырашыў прымераць на сябе амплуа былога старшыні КДБ Сцяпана Сухарэнкі. Тады спецслужбіст напярэдадні выбараў публічна заявіў, што апазіцыя рыхтуе правакацыі, а спецыяльна навучаныя людзі маюць намер дохлымі пацукамі атруціць ваду ў сталічным трубаправодзе.

Цяпер Уладзімір Макей падзяліўся звесткамі пра тое, якія непрыемнасці чакаюць тых, хто выйдзе на акцыю пратэсту, што плануецца пасля выбараў. «Ужо вядома, што яны не збіраюцца мірна праводзіць гэтае мерапрыемства. Ужо рыхтуюцца групы баявікоў, ужо закупляюцца цёплыя рэчы, піратэхнічныя і нават выбуховыя рэчывы. Таму апазіцыйныя кандыдаты адназначна нацэльваюць людзей, нацэльваюць сваіх прыхільнікаў на правакацыі, на стварэнне выдатнага «малюнку» для заходняга тэлебачання, каб потым сказаць: вось бачыце, якая яна, улада, — жорсткая, як яна жорстка абыходзіцца са сваімі выбарцамі», — распавёў Уладзімір Макей.

У адказ на заяву Макея апазіцыйныя палітыкі накіравалі зварот да кіраўніка МУС, старшыні КДБ і генпракурору Беларусі з просьбай праверыць гэту інфармацыю. «Калі ў спадара Макея ёсць якія-небудзь факты, якія пацвярджаюць наяўнасць выбухоўкі, або нейкія запасы, або групоўкі, што збіраецца штосьці рабіць на плошчы 19 снежня, трэба абавязкова і неадкладна гэтых людзей арыштаваць. Паказаць па ўсіх каналах тэлебачання, назваць прозвішчы, сказаць, адкуль у іх грошы», — заявіў кандыдат у прэзідэнты Яраслаў Раманчук.

### ЮРЫЙ ЖАЎНОЎ



Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола» (АБФФ) абвясціла лаўрэатаў гэтага года. Лепшым футбалістам краіны стаў галкіпер піцерскага «Зеніту» і зборнай Беларусі Юрый Жаўноў. Спіс лаўрэатаў 2010 года апублікаваў друкаваны орган АБФФ газета «Усё аб футболе». У апытанні па вызначэнні лепшых удзельнічалі 468 журналістаў і спецыялістаў. Юрый Жаўноў набраў 407 балаў. Другое месца заняў паўабаронца «Растова» Аляксандр Кульчый (330 ачкоў), а замкнуў тройку лепшых форвард барысаўскага БАТЭ Віталь Радзівонаў (297).

Ураджэнец Добрушу Юрый Жаўноў пачаў гуляць у футбол у 7 гадоў, а ў 14 пачаў займацца ў Рэспубліканскай вучэльні алімпійскага рэзерву (Мінск). За час спартовай кар'еры займеў чэмпіёнскія званні ў Беларусі і ў Расіі. У сакавіку гэтага года быў абраны капітанам нацыянальнай зборнай Беларусі.

Лепшым гульцом чэмпіянату Беларусі стаў бразільскі паўабаронца БАТЭ Рэнан Брэсан, які набраў 190 балаў. Лепшым беларускім трэнерам стаў настаўнік БАТЭ Віктар Ганчарэнка (217).

Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў 2010 года адбудзецца 17 снежня.

### НАТАЛЛЯ ШКАДУН



Шматдзетная маці з Магілёва Наталля Шкадун праз галадоўку дамагаецца для сваёй сям'і паляпшэння жыллёвых умоваў. За пяць дзён галадоўкі, як гаворыць Наталля, непасрэдна з ёй прадстаўнікі ўлады не выходзілі на кантакт. Кіраўніцтва медыцынскай установы, дзе яна працуе, пераконвае спыніць галадоўку, таму што гэта пагражае здароўю, перадае «Радыё Свабода». Жанчына расказала пра свае жыллёвыя праблемы даверанай асобе Лукашэнкі Валеру Шаршунову. «Ён нават нічога не запісаў. Нічога не хацеў слухаць. Адразу адправіў мяне ў грамадскую прыёмную Лукашэнкі. Яму наогул было ўсё адно, хто з якімі праблемамі прыйшоў. Я ўвогуле не магу зразумець, навошта патрэбныя такія даверaныя асобы», — кажа Наталля Шкадун.

Яна заяўляе, што будзе галадаць да рашэння сваіх жыллёвых праблемаў. Наталлі Шкадун 51 год. У яе вышэйшая адукацыя. Яна практыкуючы лекар першай катэгорыі. Ганаровы донар. У яе пяцёра дзяцей. Чацвёра з іх — няпоўнагадовыя. Сям'я абыходзіцца без сацыяльнай дапамогі. У трохпакаёвай кватэры памерам 63 квадратныя метры пражывае дзевяць чалавек.

АД РЭДАКТАРА

# БЕЛАРУСКІЯ ВЫБАРЫ ПАМІЖ ЗАХАДАМ І ЎСХОДАМ

**Працяг. Пачатак на стар. 1.**

Відавочна, што кампанія 9 апазіцыйных кандыдатаў мае і пазітыўныя вынікі. Найперш сваім інфармацыйным і эмацыйным уплывам праз выступы ў прамым эфіры, і асабліва ў тэледэбатах, дзе ўсе кандыдаты спрацавалі адзінай камандай, звярнуліся да грамадства па сутнасці з адзіным пасланнем: мы ўсе — апазіцыя існуючай палітычнай сістэме, дзейнаму начальніку дзяржавы. На вачах развеяўся створаны прапагандай міф: «а хто замест яго». Аказваецца, ёсць. Здольныя і адэкватныя, адукаваныя і прывабныя. Розныя, на любы густ. Развеяўся і другі міф пра адсутнасць у апазіцыі канструктыўнай праграмы.

З вуснаў кандыдатаў публічна прагучала столькі крытыкі і ў такіх адкрытых фармулёўках, колькі грамадскасць не чула за ўсе 16 гадоў. І за якія яшчэ ўчора прыцягвалі да суду, штрафавалі і адпраўлялі па этапу па наўмысна прыдуманым артыкуле за абразу гонару. За якія арыштоўвалі тыражы газет і зачынялі газеты.

Свабоднае слова, пікеты, сходы, мітынгі і шэсці ў забароненых яшчэ ўчора месцах адчувальна разрэдзілі атмасферу страху, паднялі градус грамадскай актыўнасці. Аднак, вельмі б хацеў памыліцца, не настолькі, каб безыменная дзявятка апазіцыйных кандыдатаў магла зламаць жалезны ўладны сцэнар падліку галасоў. 9 апанентаў у беларускіх умовах — гэта несур'ёзна і для Захаду, і для Усходу.

## Заходні вектар

Адсутнасць адзінага, няздольнасць дэмакратычных сілаў да аб'яднання з'явілася дадатковай прычынай, якая паўплывала на змену прапорцый у стасунках Захаду з апазіцыяй і ўладамі на карысць апошняй. З разлікам паспрабаваць наўпрост уздзейнічаць на палітыку Мінска. А вось дзеля чаго?

Дзеля прагматычных эканамічных выгод? Наўрад ці гэтыя матыў — асноўны. Хутчэй, дзеля лібералізацыі беларускай эканомікі — матывацыя афіцыйна агучаная Брусэлем. Але не цаной адыходу, як папракалі ЕС некаторыя беларускія палітыкі, ад прынцыпаў каштоўнасцей. Вернасць ім, пацвярджэнне гатоўнасці ЕС да аднаўлення базы дамоўленасцей з Беларуссю толькі пры ўмове, калі Мінск зробіць крокі ў бок выканання прынцыпаў дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства права, — гучаць пастаянна з вуснаў усіх еўрапейскіх палітыкаў, на ўсіх узроўнях.

Але ніхто не адмяняў тайнай дыпламатыі. І не выключана, што А. Лукашэнка атрымаў нейкі пакет прапаноў па лібералізацыі палітычнай сістэмы Беларусі пад тыя ці іншыя гарантыі для сябе. Ва ўсялякім разе, асцярожная і размытая фраза аб нейкім пераходным плане, даведзеным да беларускіх улад, прагучала з вуснаў еўракамісара Штэфана Фюле на яго прэсавай канферэнцыі па выніках візіту ў Мінск.

Але пайсці на сапраўды свабодныя выбары, а значыць, рэальна рызыкаваць стратай пасады, немагчыма для Лукашэнкі. «*Может быть, я только сейчас готов исполнять президентские полномочия в полном объеме*, — душэўна дзяліўся ён сваімі думкамі з трыбуны Усебеларускага сходу, — *потому что, еще раз подчеркиваю, я знаю весь мир*».

## Усходні вектар

Дзеля захавання сваёй улады А. Лукашэнка зноў развярнуўся ў бок расійскага кіраўніцтва. Ці яго развярнулі? Здаўся на яго міласць? І на якіх умовах? Ці наогул без умоў? Сустрэча беларускага кіраўніка з прэзідэнтам Расіі Мядзведзевым і дасягнутыя імі дамоўленасці для большыні грымнулі як нечаканасць.

Але ці сапраўды нечаканасць. А можа, усё ж падрыхтаваная нечаканасць, вынік паспяхова рэалізаванага плана? Ва ўсялякім разе, для ўважлівага наглядальніка не засталося незаўважаным, як сцішылася хваля інфармацыйнай вайны. Што ўжо на сустрэчы спадара Нарышкіна, кіраўніка спраў Адміністрацыі расійскага прэзідэнта, з беларускімі журналістамі, прагучала гатоўнасць Масквы даравацъ свайму беларускаму візаві яго выпады. Услед за Нарышкіным прагучала і паблажлівае ад Пуціна — наконт хатняй сваркі паміж родзічамі.

Гэта тлумачэнне сталася вельмі папулярным пасля маскоўскага прымірэння. Лукашэнка атрымаў палітычны падарунак не толькі пад выбары, але і эканамічны на доўгі час пасля выбараў — прэферэнцыі па нафтавых мытах і цэнах на газ. Па розных ацэнках — ад 2 да 4 мільярдаў долараў у год. (не восем, што былі, але можна пратрымацца і пазбавіцца ад боязі сацыяльнага выбуху).

Стала відавочнай канчатковая мэта інфармацыйнай вайны, разгорнутай Масквой супраць Мінска, — не мадэрнізацыя, не сапраўдныя дэмакратычныя перамены, пра што не раз заяўлялася, а «*укрощение строптивого*», прывядзенне яго да васальнай залежнасці. І ўсе ранейшыя папрэджванні спісаны як адпрацаваны хлам. У тым ліку і вось гэта выказванне прэсавага сакратара расійскага прэзідэнта: «*Лукашенко сделал невозможным возврат к прежним отношениям*».

Але дастаткова перагарнуць старонкі гісторыі, каб упэўніцца, што аўтарытарныя рэжымы не маюць незваротных кропак, маральных абмежаванняў, пачуцця годнасці. І толькі сапраўды дэмакратычная Расія, калі яна такой стане, не будзе ўяўляць сабой пагрозы незалежнасці Беларусі. Пакуль што гэтая пагроза толькі ўзрасла.

Зразумела, што А. Лукашэнка не змірыцца з роляй васала. Невыпадкова ж на Усебеларускім сходзе з яго вуснаў зноў прагучалі туга па СССР і ідэя аднаўлення нейкага цэнтра сілы на нашай на славянскай, на беларускай зямлі. Але перамога яго пірава, як на маскоўскім напрамку, так і ў Беларусі.

Хутчэй за ўсё, адпаведныя лічбы за абранне Лукашэнкі на чарговы тэрмін будуць намаляваныя, як заўсёды. І мы не ведаем, якой на гэты раз будзе Плошча. Плошчай надзеі, пачаткам пераможнага руху да хуткіх перамен? Але ведаем дакладна, што гэтыя яперамены можам ажыццявіць толькі мы самі. І ніхто — ні Захад, ні Усход — не можа зрабіць гэта за нас.

КАНДЫДАТЫ

# ХЛУСНІ Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ СТАЛА ЗАМНОГА

**Вольга ХВОІН**

**Агітацыйная кампанія кандыдатаў у прэзідэнты розніцца найперш доступам да рэсурсаў — чалавечых і матэрыяльных. Нехта можа ладзіць гадзінны выступ-сход у Палацы рэспублікі з трансляцыяй на ўсю краіну, а хтосьці едзе за сотню кіламетраў дзеля сустрэчы з некалькімі дзясяткамі выбарцаў.**



Кандыдат ад партыі БНФ Рыгор Кастусёў едзе ў Вілейку на сустрэчу з выбарцамі. Выбары ў снежні напраўду няздурчныя. На дварэ холадна, цямнее рана, у людзей думкі пра дом і калядныя святы, а не пра лёсавызначальную падзею дзяржавы. Дарога па цёмным заснежаным шасэ падаецца крыху ірэальнай — чаму гэтаму чалавеку не сядзіцца ў цяпле, калі праца яго падаецца сізіфава?

— Стаміўся фізічна за гэты час, — прызнаецца кандыдат у прэзідэнты Рыгор Кастусёў, але тут жа з імпэтам расказвае пра свае паездкі па рэгіёнах. — У Брэсце на сустрэчу са мной чыноўнікі не прыйшлі, дык нават сумна без іх, пытанняў правакацыйных ніхто не задае. Нестае адрэналіну, а мне падабаецца, калі востра.

За час выбарчай кампаніі Кастусёў мае намер аб'ехаць каля 50 гарадоў і пасёлкаў краіны — «ад Хоцімска да Камянца». Пакуль едзем да Вілейкі, спадар Рыгор ахвотна адказвае на пытанні, гаворыць проста, без гонару.

— Стаўленне да Лукашэнкі ў краіне рознае. Ёсць тыя, для каго ён кумір, ёсць і тыя, хто прыглядваецца да альтэрнатыўных кандыдатаў. Нядаўна на сустрэчу прыйшлі бабулі, адкамандзіраваныя Саюзам ветэранаў. Спачатку пытанні правакацыйныя задавалі, а пасля падышлі ў фае і хваліць пачалі, маўляў, я такі добры. Чуткі даходзілі, што і ў Адміністрацыі прэзідэнта да мяне прыязна ставяцца, а з Магілёўскага выканкама чыноўнік нешта сказаў, што маральная перамога за мной. Відаць, абмяркоўвалі гэту тэму ў сваіх колах, ёсць разуменне, што і ідэі маюць права на жыццё.

Мне дагэтуль не зусім зразумела, як я стаў кандыдатам у прэзідэнты ад партыі БНФ. У нейкі момант зрабілася відавочна, што партыя мусіць удзельнічаць у гэтай кампаніі, інакш дзе б зараз нашы людзі былі? У нас былі распрацаваныя варыянты, што будзе адзіны, была працэдура правядзення кампаніі з улікам гэтага. Пасля, калі Аляксандр Мілінкевіч заявіў, што не ідзе на выбары, і БНФ будзе са сваім кандыдатам, то якія толькі прапаноў не было, да шантажу даходзіла. Але правільна, што мы ўдзельнічаем у гэтай кампаніі, шкада толькі, што позна ўвязаліся — быў бы час больш грунтоўна падрыхтавацца. Палітыцы трэба вучыцца, як і машынай кіраваць.

Кандыдату тэлефануюць журналісты, пытаюцца пра марку яго гадзінніка, пра тое, вопратку якіх вытворцаў ён носіць. «Гадзіннік падарылі яшчэ ў 2000 годзе мае калегі з Віцебску, і марку яго я не ведаю. А гарнітур, туфлі на мне беларускай вытворчасці», — гаворыць кандыдат. Пасля, заінтрыгаваны, так і гэтак круціць уласны гадзіннік, адшукваючы на ім апазнавальныя знакі вытворцы.

У Вілейку Рыгор Кастусёў крыху спазняецца, каля ўваходу ў мясцовы Дом культуры на тумбе для аб'яў вісяць плакаты з выявамі Кастусёва, дзверы ДК залепленыя афішамі выбараў, інфармацыяй пра кандыдатаў і анонсам канцэрту П'ехі. Спадар Рыгор забягае ў залю і, не перазводзячы дыху, — да мікрафону. Паводзіць сябе даволі ўпэўнена. Калі параўноўваць з яго манераю трымацца на публіцы пару месяцаў таму і цяпер, то прагрэс відавочны. Гаворыць пра сельскую гаспадарку, аграгарадкі, сілавыя структуры, мову, культуру.

— Я нічога супраць кітайцаў не маю, але свая кашуля бліжэй да цела, таму трэба, каб нашы дзеці вывучалі беларускую мову, каб адчувалі сябе беларусамі. Інакш праз нейкі час беларусы будуць вымушаныя размаўляць па-кітайску. Ім дзесяць мільёнаў туды, дзесяць сюды... — даводзіць пра сумныя перспектывы тытульнай нацыі краіны кандыдат.

Людзі спакойна слухаюць Кастусёва, па рэпліках з залі, па згодных кіўках галовамі бачна, што на сустрэчы многа прыхільнікаў. Падымаецца нейкі дзяцюк: «Вось вы правільна гаворыце ўсё, але што наконт заробкаў, бо гэта галоўнае. Мы заробак атрымліваем 30-га, а за кватэру трэба плаціць да 25-га, хіба гэта правільна?» Рыгор Андрэевіч сваіх патэнцыйных выбарцаў супакойвае цытатамі ад Пракаповіча, прыкладамі са свайго жыцця. Ужо пасля сустрэчы завязваецца дыскусія з жанчынамі, якія працуюць у выбарчых камісіях. Яны пераконваюць кандыдата, што ніякіх фальсіфікацый ніколі не можа быць.

— Я на свае вочы бачыў чыстыя бланкі з подпісамі ўсіх сябраў камісіі, вы хочаце, каб я зараз паверыў сваім вушам і не паверыў сваім вачам? — кажа спадар Рыгор.

Ад фальсіфікацый размовы перацяклі да Плошчы, адна з жанчын прасіла гарантый, што яе дачка, калі туды пойдзе, застанецца жывая і здаровая...

Калі Рыгор Кастусёў выходзіў з Дома культуры пасля сустрэчы, то плакаты з яго выявай ужо былі пазрываныя. Мясцовыя партыйцы разводзілі рукамі: «Зрывае нехта, не паспяваем вывешваць».

— Калі аднойчы зменіцца ўлада, то даказаць, што Лідзія Ярмошына фальсіфікавала выбары, будзе цяжка. Доказы будуць на тых, хто дакументы, пратаколы падпісваў. А гэта старшыні камісій. А ёй што прад'явіць? Не думаю, што недзе будуць дакументальна аформленыя загады на махінацыі, — разважае спадар Рыгор на зваротнай дарозе ў Мінск. — Не думаю, што ў некага ёсць канкрэтны план наконт Плошчы. Так, напрацоўкі ёсць. Але хто дакладна ведае, што будзе? Мы сустракаліся з некаторымі кандыдатамі, размаўлялі пра Плошчу. Ніхто не хоча браць на сябе адказнасць за магчымыя ахвяры, весці людзей на барыкады. І нашай партыі не трэба гэта, не трэба заплямлівацьсябе крывёй, бо каштоўнасць чалавечага жыцця несуадносная з амбіцыямі. Увогуле, пытанняў цяпер больш, чым адказаў. Але хлусні ў нашым жыцці стала замнога, і з ёй трэба сканчаць, немагчыма жыць у хлусні.

МЕРКАВАННЕ

# ЛУКАШЭНКУ ПЕРАМОЖА ПАДОБНЫ

**Кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў прапанаваў сваім калегам-супернікам па прэзідэнцкай выбарчай кампаніі супольна сысці з дыстанцыі. Станоўчага адказу на гэтую прапанову не было, а некаторыя кандыдаты гаварылі, што пра такую ідэю даведаліся са СМІ, а не ад Уладзіміра Пракопавіча ці прадстаўнікоў яго перадвыбарчага штабу. Згоды ў шэрагах кандыдатаў як не было, так і няма. Ментальныя і рэальныя слабіны апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты ацэньвае кандыдат філасофскіх навук Уладзімір Падгол.**



Уладзімір Падгол



***— Ці была эфектыўнай прапанова Уладзімера Някляева ўсім альтэрнатыўным кандыдатам зняцца з выбараў?***

— Гэта быў палітычны блеф, падобны на дэмарш Някляева, калі ён сышоў з тэледэбатаў. Сыход з дыстанцыі ўсіх альтэрнатыўных кандыдатаў быў бы рацыянальным пасля першага дня датэрміновага галасавання. Як толькі назіральнікаў выведуць з участкаў, не дазволяць ім прысутнічаць там уначы, на наступны дзень трэба ўсім здымацца. Бо гэта сведчыць, што пачынаецца начное ўкідванне бюлетэняў, выбары скончыліся, пачалося палітычнае махлярства.

Сёлета падчас кампаніі не было гучных пераследаў актывістаў апазіцыі, але не трэба забывацца, што СМІ — гэта чацвёртая ўлада, таму ў час выбараў непрапарцыйнага падзелу эфірнага часу не можа быць. Кандыдаты атрымалі гадзіну для выступаў і гадзіну для дэбатаў на БТ, у той жа час Аляксандр Лукашэнка толькі на Усебеларускім сходзе выступае ў прамым эфіры тры гадзіны. Вялікая хіба апазіцыйных кандыдатаў, што яны не засяродзілі ўвагу грамадскасці на гэтым факце. Калі вы вылучаецеся ў прэзідэнты, то змагайцеся па ўсіх правілах бітвы.

***— Што вы разумееце пад бітвай?***

— Расійскі тэлеканал НТВ паказвае серыял «Хросны бацька». Пасля першай серыі актывісты апазіцыі выйшлі да Акадэміі навук з партрэтамі зніклых палітыкаў. Тэледэбаты. Я ўключаю тэлевізар з чаканнем, што на тумбе перад Яраславам Раманчуком, Андрэем Саннікавым (а ён быццам бы арганізуе штомесячныя акцыі «Мы памятаем»), Уладзімірам Някляевым, які ўзяўся гаварыць праўду, будуць стаяць фотаздымкі зніклых палітыкаў. Кожны з кандыдатаў меў магчымасць пераўзысці Аляксандра Казуліна па вастрыні ўзнятай праблемы. Чаму не паказалі партрэты гэтых людзей, не працытавалі Лукашэнку, які гаварыў генпракурору Бажэлку: «Ты давёў мяне да знемажэння. Я начамі не сплю, глытаю жменямі таблеткі. А ты капаеш, капаеш пад мяне! Кінься шукаць Захаранку і Ганчара. Вам што, трэба каб апазіцыя насіла труны з іх целамі па Мінску?» Кандыдаты мусілі заклікаць Аляксандра Лукашэнку аддаць родзічам целы, даць пахаваць гэтых людзей. Не адбылося гэтага. Прамаўчалі, партрэты не выставілі, баязліўцы. Для мяне кампанія амаль скончылася пасля гэтых тэледэбатаў.

***— Вам не падаецца, што такі падыход мог бы адштурхнуць выбарцаў, бо і так нямала негатыву агучвалася з вуснаў кандыдатаў?***

— Адна справа, як Статкевіч стварае вобраз тэрмінатара, а іншая — па-чалавечы сказаць: «Лукашэнка прызнаецца, што вінны ў знікненні людзей, як ён можа кіраваць краінай!» Казулін у 2006 годзе скарыстаўся тым жа прынцыпам, працытаваўшы Лукашэнку. У выніку апошні на Усебеларускім сходзе заявіў, што калі не будзе мець свайго дома, то пойдзе па краіне, і людзі па чарзе будуць даваць яму пераначаваць: «Ім (лідарам апазіцыі) плявать на мой лёс. На нейкі лёс аднаго чалавека. Хай нават прэзідэнта. Бог ты мой! Яму трэба асабняк там нейкі пабудаваць, мільён у кішэню пакласці. Ды я выжыву, па добрых людзях пайду, яны мяне на кожную ноч прымуць, пераначую і так сваё жыццё пражыву да ста гадоў!» Тады свой выступ ён фактычна прысвяціў завочнай палеміцы з Казуліным, бо вымушаны быў апраўдвацца.

***— То бок цяпер немагчыма сыграць на эканамічных пытаннях, як спрабавалі зрабіць кандыдаты?***

— Польская «Салідарнасць» выбухнула, калі рэзка падвысілі кошты на мяса. У 1990-я гады на Мінскім трактарным заводзе прафсаюзны лідар зарабіў сабе вядомасць, калі прыкаваўся кайданкамі да станку на знак пратэсту, што перасталі рабочым выдаваць мыла. Цяпер падобнай падставы для сацыяльнага выбуху няма, хаця кошты на хлеб растуць няўмольна. Толькі што ўлады гэта робяць пакрысе, а пад выбары яшчэ прыкармілі падвышэннем заробкаў, бясплатным праездам для школьнікаў.

***— Гэта неразуменне сітуацыі ці проста слабасць кандыдатаў, іх каманды?***

— Пытанне не да мяне, а да кандыдатаў.

***— Якія тэмы, апроч зніклых людзей, мусілі ўзняць палітычныя апаненты Лукашэнкі, але не зрабілі гэтага?***

— Існуе дамова пра стварэнне Саюзнай дзяржавы, што, на маю думку, антыканстытуцыйна, бо частка суверэнітэту дэлегуецца Саюзнай дзяржаве. АДКБ — паліцэйскія войскі хуткага рэагавання. Чаму маўчанне? Трэба сказаць, што яны супраць мытнага саюзу, адзінай эканамічнай прасторы з Расіяй. Агульная хіба кандыдатаў, акрамя Рыгора Кастусёва, што ніхто з іх не гаворыць пра выхад з гэтых дамоваў, пра тое, што забіраюць наш суверэнітэт. Нямногія ведаюць, што на 19 снежня запланаваная сустрэча кіраўнікоў Беларусі і Расіі, каб стварыць Адзіную Эканамічную Прастору. Мытны хаўрус з Расіяй і АЭП — гэта страта нашай эканамічнай незалежнасці. Гэта пакрокавае паглынанне Беларусі Расіяй.

А Лукашэнка цяпер выйграе: едзе ў Маскву, зноў свеціцца на экранах тэлебачання, падпісвае дамову аб адзінай эканамічнай прасторы, размова ідзе аб нафце, мытах. Людзі не разбіраюцца і думаюць, што ўсё будзе па-старому. Атрымліваецца, кандыдаты не выйшлі на агульнадзяржаўны ўзровень, не той маштаб.

***— Хто з кандыдатаў для вас найбольш моцны?***

— Ніхто. Ніхто з іх не змог кінуць выклік Лукашэнку. У Міколы Статкевіча дваравая рыторыка: «Эй, ты, подлый трус, выходи!» Вось такую агрэсію выбарцы ўспрымаюць адмоўна. Спачатку трэба паказаць дзяржаўнасць, а пасля зваць на барыкады. Нават Дзмітрый Ус, які мае праблемы з маўленнем, выглядаў больш прывабна як канкрэтны палітычны бізнэсовец з канкрэтнаю мэтай: «Я прыйшоў на прэзідэнцкія выбары, каб змяніць заканадаўства».

**Калі ставіць мэту перамагчы Аляксандра Лукашэнку, то трэба мець разуменне, чаму яго падтрымліваюць, чаму ён выклікае давер і нават любоў у некаторых**

Да слова, за час выбарчай кампаніі былі рэпрэсіі, хаця нам і паказваюць яе як ліберальную. У Віцебску быў затрыманы Барыс Хамайда за пікет у падтрымку байкоту, прыязджалі назіральнікі з АБСЕ, і Хамайду вызвалілі. Дык вось пытанне да Някляева, чаму ён не паехаў у Віцебск, ніяк не адрэагаваў на затрыманне Хамайды, які выступіў з ідэяй Някляева? Атрымліваецца, што лідар кампаніі «Гавары праўду» маўчыць, калі яму тое нязручна. А пасля абураецца, што яго не падтрымалі, калі агучыў сваю прапанову. Гэта імітацыя праўды. У Някляева ёсць сродкі, але няма спраў. Ідэя «Гавары праўду» папросту дыскрэдытаваная. Прыклад з Барысам Хамайдам не адзінкавы. Каб зараз я станоўча ацаніў дзейнасць Уладзіміра Някляева, то ён мусіў не хлусіць ніводнага разу.

Прэзідэнцкія выбары ва ўмовах таталітарызму можа выйграць той чалавек, які выйграе іх маральна да афіцыйнага аб'яўлення выбараў. Бо што б ты ні зрабіў пасля афіцыйнага старту кампаніі, прапаганда скажа, што твае дзеянні толькі дзеля выбараў. Выйграваць выбары Някляеву трэба было за пяць год. Народ мог паверыць у шчырую дзею, дзеля абароны інтарэсаў многіх людзей, у нешта самаахвярнае, шчырае.

Калі ставіць мэту перамагчы Аляксандра Лукашэнку, то трэба мець разуменне, чаму яго падтрымліваюць, чаму ён выклікае давер і нават любоў у некаторых. У Аляксандра Лукашэнкі моцны архетып, архетып Перуна, які, паводле міфалогіі, мае здольнасць заганяць злыя сілы назад у свае сховішчы, і таму непераможны. Адпаведна, мусіць з'явіцца чалавек з няменшай энергетыкай, які зможа яму супрацьстаяць. Да таго ж у Лукашэнкі феномен сацыяльнага ідала, якім ён стаў у 1993 годзе, калі прачытаў даклад пра карупцыю.

Феномен сацыяльнага ідала мае некалькі аспектаў. Першае: людзі на ірацыянальным узроўні імкнуцца зліцца з ідалам, хочуць яго чуць і бачыць. Новыя пакаленні таксама ментальна абіраюць Лукашэнку. Існуе ідэалагема — скарочаны сказ, які адлюстроўвае стан ментальнасці. У нас прапаганда апелюе да стабільнасці, што нам не патрэбны рэвалюцыі, перамены, якія прыносяць кепскі вынік.

Як перашыбіць сацыяльнага ідала? Гэтую сцяну можна прабіць толькі тады, калі з'явіцца суперідал, які высесніць з мазгоў людзей Лукашэнку. Паглядзіце, яшчэ няма заробку ў 500 долараў, а ўжо ў галовы ўбітае абяцанне на тысячу долараў.

## КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# НАХАБНІК ДЗЕМЯНЦЕЙ



**Непасрэдна перад прэзідэнцкімі выбарамі ўлада вырашыла скарыстаць прапагандысцкія паслугі многіх вядомых у краіне дзеячаў. І тых, хто сёння мае элітны сацыяльны статус, і тых, што былі, як кажуць, знакавымі фігурамі ў мінулым.**

Былыя парламентарыі, былыя прэм'еры, былыя спартсмены, сённяшнія лідэры грамадскіх аб'яднанняў і рухаў.

Па сваіх адметных асабістых якасцях па-за межамі канкурэнцыі аказаўся былы старшыня Вярхоўнага Савета БССР Мікалай Дземянцей. Людзі сталага веку, якія памятаюць яго лапідарна-трапны выраз пра дэпутатаў, што «скапліваюцца ў заднім праходзе», задаволена ўздыхнулі — жывы стары краснабай! І адначасова жахнуліся — якая, пардон, бязглуздзіца. Спачатку Мікалай Іванавіч гаварыў як па пісанаму і, мусіць, тое, што было патрэбна яго суразмоўцу-журналісту з БелТА. Ён добрым словам памянуў выбранае некалі для Беларусі прэзідэнцкае праўленне, ухваліў таго чалавека, якога час абраў заняць гэту пасаду.

Не было нічога дзіўнага, што ён адмовіў «асобным прэтэндэнтам на галоўную пасаду ў краіне» ў праве заклікаць народ на плошчу, бо «шлях экстрэмізму — гібельны шлях». Маўляў, ён крымінальны, нікуды не вядзе ў сэнсе сацыяльна-эканамічным, але падлягае пераследу па закону.

Так яно ў Беларусі і ёсць, і ёсць адпаведныя законы, і калі будзе патрэба, будуць напісаны яшчэ больш адпаведныя. Вядома ж, у нас існуе такі падзел працы — адны закон пішуць, а іншыя змушаюць усіх астатніх яго выконваць. Таму першыя стаяць над законам, другіх закон бароніць, а абсалютную большасць трэціх — змушае выконваць, як некалі лічыў Ленін, волю правячага класа. Такіх вось Мікалаяў Іванавічаў.

Пакуль таварыш Дземянцей распавядаў пра сваё разуменне сучасных палітычных ды сацыяльных рэалій, усё было добра. Але нейкі нячысцік, так бы мовіць, другое «Я», падштурхнуў яго да гістарычных экскурсаў. У выніку мы даведаліся, што ўсе распады буйных геапалітычных аб'яднанняў (ці гэта развал Свяшчэннай Рымскай Імперыі, ці Савецкага Саюза) вядуць да агромністай затрымкі ў развіцці дзяржавы. Гэта ўжо нейкае сапраўднае ноў-хаў у сацыяльных навуках.

Бо раней лічылася, што Савецкі Саюз ёсць дзіцём ад пазашлюбнай сувязі Кацярыны Другой з Карлам Марксам, а аказваецца, ён стаўся нашчадкам феадальна-тэакратычнай дзяржавы, створанай імператарам Аттонам Першым, якая з сярэдзіны 16 стагоддзя называлася Свяшчэннай Рымскай Імперыяй германскай нацыі, пасля 1806 года — Германскім Рэйхам, пасля 1933 года Трэцім рэйхам. Бо Гітлер, калі ўзначаліў яго, для ажыццяўлення гістарычнай справядлівасці паставіў мэтай аднавіць нямецкі парадак ва ўсіх краінах, якія некалі ўваходзілі ў склад Першага рэйха. А за кампанію (дзеля пашырэння жыццёвай прасторы германскай нацыі) вырашыў прыхапіць і тое, што да рэйха ніколі не належала — Беларусь, Украіну, лепшую (еўрапейскую) частку Расіі. Да вясны 1945 года аб'яднаным нацыям, у кампаніі якіх годную ролю адыгралі і беларусы, удалося адбіцца ад Гітлера. І гэта сталася вышэйшай праявай сацыяльнага прагрэсу за ўвесь час пісьмовай гісторыі чалавецтва.

Прынамсі, так лічылася да гэтага самага часу. Да такой думкі схіляліся насельнікі Італіі, Аўстрыі, Венгрыі, Чэхіі ды іншых краін Цэнтральнай Еўропы, якія некалі былі больш-менш самастойнымі правінцыямі імперыі германскай нацыі. Увогуле, калі кінуць погляд на палітычную карту свету, то амаль пра кожную сучасную краіну можна сказаць, што яна некалі была ці правінцыяй, ці нават калоніяй той ці іншай імперыі. Адны належалі германцам, другія — туркам, трэція — англічанам ці партугальцам.

І каб не распад імперый, так і засталіся б правінцыямі.

Тое ж самае і з Беларуссю, хоць яна мела іншых гаспадароў. Разважанні Мікалая Іванавіча пра сівую даўніну ўвогуле смешныя. Бо нельга ж уявіць былога намінальнага прэзідэнта Савецкай Беларусі, які маркотна круціць глобус у роздуме, што б яшчэ падключыць да складу Беларускай імперыі. Але енкі пра СССР, без распаду якога не было б нашай дзяржавы, па-першае, надакучылі, па-другое, маюць усе прыкметы дзяржаўнага злачынства. Бо ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якую ўхваляе Дземянцей за ўключэнне прэзідэнцкай формы кіравання, запісана, што яна з'яўляецца суверэннай унітарнай краінай. І з гэтай нагоды ніякія (хоць бы па-старэчаму настальгічныя) разважанні на тэму, як яно было б лепей, з'яўляюцца недапушчальнымі.

Даўно трэба зразумець усім (асабліва тым, хто дзякуючы Віскулям атрымаў у рукі ўладу і не збіраецца яе аддаваць), што дзеля незалежнасці Беларусі СССР падлягаў разбурэнню. Як некалі Карфаген для Рыма.

Пры мностве гарантаваных беларускам правоў, Канстытуцыя не дае нікому, ні адной асобе, права ставіць пад сумнеў факт яе незалежнага існавання.

Такім нахабнікам можна хіба паспачуваць. Маўляў, старое, што малое. Але толькі пасля судовага выраку.

## ВЫБАРЫ

# КОЖНЫ ПАВІНЕН БАРАНІЦЬ СВАЕ ПРАВЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Міжнародны дзень правоў чалавека праваабаронцы адзначылі выхадам на вуліцу. Яны нагадалі беларусам пра тое, што за свае правы трэба змагацца.**

«Адчуванне вакууму ўлады, адсутнасці інструментару дзяржаўнай палітыкі ў момант, калі ён найбольш запатрабаваны, на руку тым групоўкам у апараце ўлады, што ставяць перад сабой задачы, якія ляжаць убаку ад інтарэсаў фанатаў. У першую чаргу, гэта выгодна кланавым структурам рознага кшталту. Любым — этнічным, сацыяльным, асацыяльным, ідэалагізаваным… Наша грамадства — гэта палітра з кланаў рознай велічыні, вялікіх і маленькіх. Гэта абсалютна ценявая гульня, тут няма ніводнай празрыстай палітычнай сілы. А нацыяналісты — пешкі ў чужой гульні. Калі дзесьці ёсць «не наш» пракурор, начальнік міліцыі, губернатар, мэр — спіс лёгка працягнуць, — можна расхістаць сітуацыю, а потым пачаць крычаць, што ён не спраўляецца, і таму яго трэба прыбраць» (Алег Паўлоўскі).

### Версія 8.
Пачатак рэалізацыі плану акупацыі Расіі амерыканцамі

«Цяпер тая бойка на Манежы будзе раздзімацца праз СМІ. Пасля аплачаныя экстрэмісцкія групы адмарозкаў пад нацыянальнымі лозунгамі пачнуць «мачыць чорных». Пасля экстрэмісцкія групы адмарозкаў, аплачаныя тымі ж людзьмі, пачнуць мачыць рускіх. У гэты працэс будуць уцягваюцца ўсё новыя і новыя сілы. Увесь час усім у галаву будзе піхаецца салянка з праўды і хлусні. Ужо ніхто нічога не разумее — хто мае рацыю, хто вінаваты. Кожны пачынае ваяваць з кожным незразумела навошта. Далей, калі будзе пройдзена кропка незвароту, пачнецца ўсеагульная грамадзянская вайна. Затым, каб задушыць масавыя хваляванні, уводзяцца «блакітныя каскі» ААН. Адпаведныя законы прынятыя. Паліцыя РФ ужо будзе гатовая ім дапамагаць» (Slon.ru).

### Версія 9.
Правал міжнацыянальнай інтэграцыі

«Трэба прызнаць існаванне тэрору з боку каўказскіх моладзевых банд. Ён выкліканы сацыяльнай катастрофай на Каўказе, дзе ўзровень сацыяльнай дэградацыі вышэй, чым на ўсёй астатняй тэрыторыі Расіі. Адпаведна, высокі і ўзровень агрэсіўнасці. Новая моладзевая каўказская субкультура такая, што размаўляць з яе прадстаўнікамі бессэнсоўна. Людзі перакана2ныя: у мяне ёсць дыяспара, якая за мяне заплаціць. Гэта дэманструецца ўсё больш нахабна» («Независимая газета»).

Вось такі версіі сітуацыя. Сярод шматлікіх прапаноў хацелася б яшчэ выдзеліць самую эксцэнтрычную. Яе агучыў карыстальнік форуму на сайце Newland: «Я парэкамендаваў бы Кадырава ў прэзідэнты Расіі. Толькі моцны самадур здольны знішчыць антынародную крамлёўскую эліту».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Па вялікім рахунку Расія пагадзілася на тое, каб не прыціскаць Беларусь да канца. Увогуле, рашэнне носіць кампрамісны характар. І для Беларусі яно, здаецца, абсалютна прымальнае. Але прэзідэнт Беларусі — такі чалавек, які заўсёды жадае большага і заўсёды лічыць сябе самым хітрым.

**«Голос России» (Расія)**

Беларускія ўлады баяцца, што 19 снежня на плошчу выйдзе вялікая колькасць людзей, і дзейны рэжым нічога не зможа гэтаму супрацьпаставіць. Ёсць здагадка, нібыта Лукашэнка паабяцаў Мядзведзеву, што крыві ў Мінску не будзе. Таму дзяржаўныя СМІ Беларусі і высокія службоўцы робяць усё магчымае, каб запалохаць насельніцтва і пераканаць іх у тым, каб яны на плошчу не выходзілі, паколькі іх там будуць узрываць, забіваць і г.д. Гэта такі спосаб нагнятання палітычнага становішча.

**«American Voice» (ЗША)**

Газпрам з 1 студзеня павялічвае кошт на газ, у рамках наяўных дамоўленасцяў. Гэта сведчыць пра беспрасветнасць эканамічнага становішча Беларусі і пра поўную палітычную паразу на расійскім фронце беларускага прэзідэнта. У сувязі з гэтым усмешкі Лукашэнкі з яго запэўненнямі, што беларусам дэвальвацыя не пагражае, выглядаюць злавесна. Што да палітычнага жыцця ў сувязі з надыходзячымі выбарамі, тое падпісанне дамоўленасцяў па АЭП яшчэ не азначае, што Расія вырашыла падтрымаць Лукашэнку ў чарговым штурме прэзідэнцкага крэсла. Вырашыўшы практычныя пытанні, Масква не будзе ўмешвацца ў ход выбараў. Аднак у прадказальнасці іх зыходу расійскія ўлады былі ўпэўнены даўно. Да выбараў прэзідэнта Беларусі засталося менш тыдня. Да ўвядзення новага кошту на газ — ледзь больш за два тыдні.

**«Сегодня» (Расія)**

Справа тут не ў Лукашэнку. Справа ў амбіцыях аднаўлення імперыі. У гэтым ключы варта разглядаць спробы ўплыву (Расіі) на Украіну, на Грузію. Ім (расійскім палітыкам) не падабаецца любы барацьбіт за незалежнасць. Лукашэнка можна прад'яўляць шмат прэтэнзій, але ён сапраўды змагаецца за незалежнасць Беларусі. Я не ведаю іншага беларускага палітыка, які б так паспяхова змагаўся за незалежнасць сваёй краіны.

**Барыс Беразоўскі ў інтэрв'ю ИМК (Расія)**

Цяпер беларуская эканоміка ледзь трымаецца на нагах. Дадаткова пагаршае справу папулісцкая перадвыбарная шчодрасць Лукашэнка, які павялічыў на траціну зарплаты ў дзяржаўным сектары, раззлаваў гэтым МВФ і падвоіў дэфіцыт бюджэту. Еўрасаюз ясна даў зразумець, што далейшую падтрымку гатовы аказваць толькі ў абмен на рэальныя ліберальныя рэформы. Такім чынам, Лукашэнка можа выйграць выбары, але яго краіна ў любым выпадку прайграе.

**«Newsweek» (ЗША)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ




### УКРАІНА. ПАДРУЧНІКА НЕ БУДЗЕ

Ідэя стварэння ўкраінска-расійскага падручніка па гісторыі праваліласся. Гэта былі вымушаны прызнаць галоўны ініцыятар праекту міністр адукацыі Украіны Дзмітрый Табачнік і дырэктар расійскага інстытуту агульнай гісторыі Аляксандр Чубар'ян. Па словах апошняга, бакі не здолелі знайсці кампрамісную версію гісторыі братніх славянскіх народаў. Таксама не ўдалося выпрацаваць метадалагічную інструкцыю для выкладання па гэтаму падручніку. Як і трэба было чакаць, гісторыкі абедзвюх краін не змаглі знайсці агульнага падыходу ў ацэнках гістарычнай спадчыны шэрагу ўкраінскіх палітыкаў — Мазепы, Пятлюры і Бандэры.

Цяпер надзеі прыхільнікаў стварэння агульнай гісторыі хаця б для славянскіх народаў СНД звязаныя з праектам «Краіна ў агні». Гэта будзе акадэмічнае выданне, куды расійскія, украінскія і беларускія гісторыкі напішуць блокі пра гісторыю другой сусветнай вайны ў сваіх краінах. Таксама рыхтуецца акадэмічны зборнік «Дыскусійныя пытанні агульнай гісторыі Расіі і Украіны».

Нагадаем, што ўвесну спадар Табачнік абяцаў стварыць украінска-расійскі падручнік агульнай гісторыі да канца 2010 года.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### РАСІЯ. МІРОНАЎ ХОЧА ПЕРАПЛЮНУЦЬ ЗЮГАНАВА


Сяргей Міронаў

У партыі «Справядлівая Расія» пачалася рэформа, ініцыяваная лідарам Сяргеем Міронавым. Перад саратнікамі пастаўленая амбіцыйная задача — «Справядлівая Расія» «павінна стаць партыяй №2» на выбарах у Дзярждуму. Для гэтага, як заяўлена ў афіцыйным паведамленні «Справядлівай Расіі», будзе скарочана «60 працэнтаў супрацоўнікаў цэнтральнага апарата партыі».

Праводзіць непапулярныя рэформы лідар «Справядлівай Расіі» Сяргей Міронаў даручыў новаму кіраўніку апарата, дэпутату ДзяржДумы Алегу Міхееву. Сам спадар Міхееў распавёў, што ў выніку скарачэння апарата і пераразмеркаванні паўнамоцтваў за кожным супрацоўнікам будуць выразна замацаваныя пэўныя функцыі.

Чаму пасля рэформы апарату эсэры пераплюнуць камуністаў на выбарах, застаецца сакрэтам. Сам спадар Міхееў адзначыў, што, паколькі пазбегнуць ужывання адміністрацыйнага рэсурсу партыяй улады не атрымаецца, пра лідуючае становішча «Справядлівай Расіі» пакуль гаворкі не ідзе.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ЗША. НОВАЯ СУСВЕТНАЯ ЗМОВА

Што агульнага ў пратэстах брытанскіх студэнтаў, скандалу з-за публікацый на Wikileaks і атакамі хакераў на розныя сайты ад імя групы Anonymous? Адказ ведае каментар каналу «Fox News» Глен Бек. На думку вядучага, якую ён агучыў 9 снежня, існуе новая сусветная змова, арганізаваная канспіратыўным ордэнам. Вам, напэўна, цікава, хто ж кіраўнікі гэтага ордэну? Адказ па Беку — Барак Абама і Джордж Сорас. Менавіта яны быццам замовілі публікацыі на Wikileaks, якія выклікалі буру ў сусветнай палітыцы. Бек прыводзіць такую схему аргументацыі: адкуль Wikileaks узяла дакументы амерыканскага МЗС? Дакументы такога ўзроўню сакрэтнасці мог сайту перадаць сам Абама. Між тым вядома, што Сорас ведаў стваральніка Wikileaks і, магчыма, яго фінансаваў. Такім чынам, ствараецца ланцужок: Абама праз Сораса дае кампрамат на ўсю палітычную эліту, правакуючы нестабільнасць. Нашто ім гэта? Каб выклікаць сусветны хаос і стварыць запыт на сусветны парадак, які павінен узначаліць, відавочна, тандэм Абама — Сорас. Вось такая версія Глена Бека. Хочаце верце — хочаце не.

**Па матэрыялах «El Publico» (Іспанія)**




▶ СПОРТ

# БЯЖЫ, КУБІНЕЦ, БЯЖЫ

**Алег НОВІКАЎ**

**Колькасць кубінскіх спартсменаў, якія бягуць у ЗША, расце ў геаметрычнай прагрэсіі. У Гаване рыхтуюць рэформу спартовай сістэмы.**



Лічыцца, што традыцыю шукаць спартовага шчасця за кардонам паклаў пітчэр (так называюць аднаго з гульцоў у бейсболе) Рэнэ Ароха. У 1991 годзе ён збег з Кубы і змог уладкавацца ў адну з бейсбольных каманд у Штатах. Прыклад аказаўся заразным. Толькі ў мінулым годзе краіну пакінулі 35 спартсменаў. З таго часу Куба штогод губляе маладыя таленты, на падрыхтоўку якіх пашлі гады і дзяржаўныя сродкі. І не толькі таленты, аднак таксама імідж.

Самы вялікі канфуз у гэтай галіне адбыўся ў 2008 годзе, калі на бейсбольным турніры ў ЗША пасля першага матчу з каманды збегла палова гульцоў. На другую гульню супраць Гандураса ледзь набралася патрэбная колькасць людзей, якія па правілах гульні мелі прысутнічаць на полі.

Апошнім вядомым уцекачом, які «праменяў радзіму на звонкую манету» аказаўся бейсбаліст Ясіель Балак'ер. На днях пасля доўгай адысеі ён дабраўся да Фларыды, дзе цяпер спрабуе ўладкавацца гульцом у амерыканскую прафесійную лігу MLB. Дагэтуль яму давялося амаль месяц правесці ў Мексіцы, хаваючыся ад агентаў кубінскіх спецслужб. Яны, па мясцовых законах, мелі права затрымаць спартсмена і вывезці яго на востраў Свабоды. Бежанцу давялося тайна прабірацца на поўнач на мяжу з ЗША, дзе кубінскія грамадзяне, у адрозненні ад усіх грамадзян іншых краін Лацінскай Амерыкі, аўтаматычна атрымліваюць палітычны прытулак.

Інфармацыя пра ўчынак Балак'ера стала трагедыяй для кубінскага бейсболу. Нягледзячы на свой 17-гадовы ўзрост, юнак быў ужо сапраўдным спартовай зоркай. Аднак цяпер яго талент будзе працаваць на MLB. Сам ён не шкадуе. «Пакінуць сваю сям'ю і перажыць момант разлукі я нікому не пажадаў бы. Але, ведаеце, гэта таго каштавала. Цяпер перада мною адчыніўся абсалютна новы свет, — цытуе хлопца «Miami Herald». — Мяне натхняе тое, што ўсё ў маіх руках і я маю магчымасць гуляць у лепшай у свеце бейсбольнай лізе. На Кубе я ўвесь час бы марыў пра гэта».

Прычым, па словах Балак'ера, землякі ведаюць нораўы прафесійнага спорту. Шмат хто з кубінскіх спартсменаў, якія збеглі ў Штаты раней, не здолелі адаптавацца да новых умоў, размянялі свой зорквы статус на Кубе на месца вядомага выключна спартовым каментатарам запаснога.

Тых, каму сапраўды ўдалося замацавацца ў складзе вядучых багатых клубаў, няшмат. Гэта прыкладна 20 бейсбалістаў, восем гульцоў у валейбол і чатыры футбаліста. Такія лічбы прыводзіць нямецкі «Jungle World».

Аднак усе гэтыя сумныя гісторыі, якія ахвотна распавядае кубінская прапаганда, перакрывае поспех Джаэля Іглесіаса і Наэля Аргуэлеса. У 2008-м яны — гульцы нацыянальнай кубінскай юнацкай зборнай па бейсболу па прыбыцці на адзін з турніраў у Канаду збеглі з гатэлю, дзе спынілася іх каманда. Праз нейкі час абодва падпісалі мільённыя кантракты. Думка пра тое, што можна паўтарыць такі шлях, акрыляе маладых спартсменаў на Кубе.

А што на Кубе? Феномен спартовых перабежчыкаў доўгі час спрабавалі разумець як пракол у асабістай выхавальнай працы. Вядучыя на ТБ крытыкавалі імперыялістычную прапаганду і Ley de Ajuste Cubano — амерыканскі закон, які дае эмігрантам з Кубы шырокія сацыяльныя правы ў Штатах (перш за ўсё, права на легальную працу).

Аднак цяпер кубінскія камуністы шукаюць новыя падыходы. У лістападзе ў газеце «Trabajadores», якая фармальна лічыцца органам прафсаюзаў, з'явіўся сенсацыйны артыкул Віктара Мезы — легендарнага бейсбаліста, а пасля трэнера. Ён прапанаваў уладам задумацца наконт стварэння сістэмы, якая б дазваляла маладым спартсменам заключаць кантракты з прафесійнымі клубамі, не губляючы пры гэтым кубінскі пашпарт.

«Іншыя краіны робяць падобным чынам. Чаму мы не можам паступаць так? Я думаю, што мы можам увесці патрабаванне. Праз 8 год гульні ў кубінскай нацыянальнай лізе гулец атрымлівае права падпісваць кантракт з замежным клубам. Прычым пад кантролем дзяржаўных органаў», — лічыць Віктар.

Ходзяць чуткі, што ў кастрычніку падчас турніру міжкантынентальнага кубку на Тайвані адбылася тайная нарада Кубінскай Бейсбольнай Федэрацыі, на якой яе прэзідэнт Антоніа Кастра агучыў ідэю такой рэформы. Больш таго, ідэю быццам падтрымалі як Фідэль, так і Рауль Кастра.

Вось яе базавыя прынцыпы: для аматараў пагуляць у замежжы ўстанаўліваецца жорсткія падатковыя патрабаванні — 40 працэнтаў прыбытку ад кантрактаў ідуць у кубінскі бюджэт. Гуляць яны змогуць у абмежаванай колькасці краін, з якімі ў Кубы добрыя стасункі: Тайвань, Японія, Паўднёвая Карэя, Мексіка, Італія. У ЗША, на думку афіцыйнай Гаваны, кубінцам гуляць некарэктна з-за складаных дыпламатычных адносін. Нарэшце, плануецца ўвесці квоту на колькасць гульцоў, якія маюць права стаць легіянерамі.

Усе каментатары згодныя ў прагнозах — рэформа праваліцца. Не пра Італію, або Мексіку, а выключна пра MLB марацьмалыя кубінцы.

Так ці інакш, рэформа вяртае на Кубу элементы прафесійнага спорту, які былі забаронены ў 1959 годзе. Цяперашні статус кубінскіх спартсменаў падобны на статус савецкіх. Яны прыпісаныя да нейкага прадпрыемства, аднак там з-за напружанага графіка трэніровак і выступаў не працуюць. Акрамя заробка бонусам за добрыя спартовыя паказчыкі ім служаць не ганарары, прапісаныя ў кантракце, а падарункі ўраду — машына або новы дом. Гэта ўсё вельмі сціпла ў параўнанні з тым, што маюць за тыя ж фізічныя высілкі атлеты ў ЗША. Смешна нават параўнаць 20–30-доларавыя заробкі кубінцаў з замежнымі.

Тое, што зараз спрабуе рабіць Гавана, да смешнага нагадвае спробы савецкіх спартовых функцыянераў вырашыць напрыканцы 1980-х гадоў тую ж самую праблему. Таксама былі ўведзеныя жорсткія патрабаванні для легіянераў: адпаведны ўзрост, высокі падатак з сумы кантракту і г.д. Сістэма ў выніку не спрацавала. Кантракты заключаліся ў абыход правілаў. Той жа Сяргей Алейнікаў з мінскага «Дынама» спакойна пераехаў у Турын гуляць за «Ювентус». У выніку ўсе пастуова перайшлі на заходнія схемы афармлення кантрактаў.

У гэтым плане мае рацыю нямецкі спартовы аглядальнік Ёрн Шульц. Яго прагноз: «прафесіяналізацыя кубінскага спорту і пераход на рэнтабельнасць будзе значыць развал усёй спартовай інфраструктуры. Лепшыя кадры адразу збягуць за мяжу, аматарскі спорт без дзяржаўнай падтрымкі папросту ляснецца. Прыпыніць адток спартсменаў можа толькі радыкальнае паляпшэнне сацыяльна-эканамічных стандартаў на Кубе».

ЦІКАВА

# ЖЫЦЬ ПА КАНКАРДАТУ

Алег НОВІКАЎ

**6 снежня афіцыйныя агенцтвы паведамілі пра тое, што Беларусь і Ватыкан вось-вось падпішуць канкардат.**

«Дакумент падрыхтаваны, і трэба маліцца, каб ён быў хутка падпісаны, але гэта пытанне апастальскай нунцыятуры», — заявіў кіраўнік Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі біскуп Аляксандр Кашкевіч.

Дзіўным чынам гэта навіна не выклікала вялікай рэакцыі ў Беларусі. Калі верыць пашукавіку Яндекса, галоўным чынам не каментуюць расійскія праваслаўныя медыя. Тон тых каментараў вельмі эмацыйны і напружаны, быццам мы напярэдадні нейкай глабальнай катастрофы.

Будзе дастаткова цытаты Кірыла Фралова, аднаго з лідэраў расійскага Саюза праваслаўных грамадзян: «Калі Лукашэнка падпіша гэты канкардат, гэта будзе знакам канчатковай геапалітычнай пераарыентацыі рэжыму Лукашэнкі ад Гістарычнай Русі да Рэчы Паспалітай. Ці ёсць магчымасць гэтага не дапусціць? Вядома, ёсць. У расійскага кіраўніцтва, апроч эканамічных, павінны з'явіцца і царкоўныя прэтэнзіі да Лукашэнкі. ...У наш час у рэспубліцы налічваецца больш за 430 каталіцкіх прыходаў — гэта вельмі мала, гэта не нагода для канкардату, які ў гэтым выпадку стане дэманстрацыі ўлады меншасці над праваслаўнай большасцю».

«Знак канчатковай геапалітычнай пераарыентацыі рэжыму Лукашэнка ад Гістарычнай Русі да Рэчы Паспалітай». Адкуль такая паніка?

Перш за ўсё, што такое канкардат? Канкардат (ад лат. concordatum — дамова) — дамова паміж Папам рымскім як галавою Рымска-каталіцкай царквы і якой-небудзь дзяржавай. Гэтая дамова рэгулюе прававое становішча Рымска-каталіцкай царквы ў дадзенай дзяржаве і адносіны з Ватыканам.

Найбольш часта Ватыкан заключаў канкардаты з Іспаніяй (5 разоў), Францыяй (4 разы), Партугаліяй (3 разы). Так, тры з чатырох канкардатаў Францыя заключыла ў пачатку XIX стагоддзя, калі ў краіне за пару гадоў змянілася некалькі рэжымаў. Пасля падзення камунізму ва Усходняй Еўропе канкардаты заключылі ўсе былыя краіны савецкага блоку, дзе каталіцызм адыгрывае важную грамадскую ролю (Польшча, Венгрыя, Літва і г.д.). Апошні раз канкардат быў прыняты ў 2008 годзе. Яго падпісалі з Бразіліяй.

Магчыма, праваслаўных лідэраў Расіі напросту палохае статыстыка. Яна сапраўды цікавая. Канкардаты з Ватыканам падпісвалі няшмат краін. Напрыклад, Аўстрыя, Бразілія, Калумбія, Харватыя, Францыя,



Германія, Вялікабрытанія, Венгрыя, Італія, Латвія, Нідэрланды, Нарвегія, Польшча, Партугалія, Святая Рымская Імперыя, Румынія, Расійская Імперыя, Іспанія і Славакія. З былога СССР канкардаты маюць толькі Латвія і Літва.

Аднак на самай справе спіс краін значна меншы. З-за рознага кшталту палітычных фактараў некаторыя краіны выйшлі з канкардатаў. Адны — таму што напросту перасталі існаваць, як Святая Рымская Імперыя. Другія — з-за ідэйных забабонаў ураду. Напрыклад, у часы рэфармацыі Англія аднабакова адмовілася ад выканання пунктаў Лонданскага канкардату 1107 года.

Асобным з'яўляецца выпадак Германіі. Канкардат падпісваў у ліпні 1933 года прадстаўнік нацысцкага ўраду. Пасля вайны Бон адмовіўся ад яго выканання. Справа дайшла да Канстытуцыйнага суда. Прадстаўнік Ватыкану змог давесці тэзіс пра тое, што пагадненне заключалася не персанальна з Гітлерам, а з нямецкай дзяржавай, якая «была і будзе». Паколькі ФРГ афіцыйна прызнавала сябе нашчадкам Веймарскай рэспублікі, суд стаў на бок Святога Рыму. Германія дасюль кіруецца пунктамі канкардату 1933 года, хаця існуюць асобныя дамовы Ватыкану з урадамі нямецкіх зямель.

Калі ўжо зайшла гаворка пра супярэчлівы канкардат з Гітлерам, трэба згадаць, што гэта не адзіны пакт, які крытыкуецца з боку прагрэсіўнай грамадскасці. Дастаецца Ватыкану за дамовы з Мусаліні (1929), гаіцянскім дыктатарам Франсуа Дзювалье (1966), яго дамініканскім калегай Трухільё (1954) і г.д.

У краінах, якія маюць канкардаты, часам існуюць цэлыя грамадска-палітычныя рухі, якія патрабуюць адмены канкардатаў або рэвізіі іх зместу. За прыкладам далёка хадзіць не трэба. Падчас нядаўняга візіту Папы рымскага ў Іспанію, левыя патрабавалі ад ураду адмовіцца ад канкардату 1977 года, які называецца Чатыры пагадненні.

Працэдура прыняцця канкардату прадугледжвае два этапы: падпісанне прадстаўнікамі бакоў і ратыфікацыя. Пры гэтым часта дакумент падпісваўся кіраўніком краіны без папярэдняга грамадзянскага абмеркавання. Атэісты сцвярджаюць, што так было ў Польшчы (1993), Партугаліі (2004).

Ёсць яшчэ ратыфікацыя парламентам. Аднак, як вядома, не ўсе парламенты дэмакратычна абраныя і могуць ісці супраць волі кіраўніка дзяржавы. Парламент можа або прыняць канкардат цалкам, або цалкам адмовіць. Папраўкі не дазваляюцца. Таксама не дазваляюцца змены ў канкардат новым абраным парламентам.

Гэта ставіць дзяржавы ў прававую пастку. Папросту парадаксальная сітуацыя склалася ў Перу ў 1980 годзе. Тут да ўлады прыйшлі дэмакраты, якія адразу прапанавалі краіне новую канстытуцыю. Адзін з яе пунктаў прызнаваў роўнасць усіх рэлігійных канфесій у краіне. Гэта супярэчыла тэксту канкардату, які прыняла раней кіруючая ў краіне хунта. Прычым яна паспела падпісаць дакумент за два дні да краху дыктатуры. Адзін з параграфаў дамовы з Ватыканам яўна супярэчыў духу новай канстытуцыі, паколькі надаваў каталіцкай царкве бенефіцы ў пытанні падаткаў, адукацыі і г.д.

У некаторых канкардатах (Італія, Партугалія), заключаных у сярэдзіне мінулага стагоддзя, забараняліся грамадзянскія шлюбы і разводы. Усё гэта відавочна супярэчыць Еўрапейскім Канвенцыям правоў чалавека і вымушае Ватыкан і ЕС шукаць нейкія кампрамісы.

Нарэшце, канкардаты, на думку шмат каго, парушаюць канстытуцыйны прынцып аддзялення дзяржавы ад царквы (хаця наколькі гэтая норма працуе ў краінах СНД, можна паспрачацца). У некаторых краінах канкардаты даюць аўтаномію каталіцкім вучэбным ведамствам. Так, у Славакіі дзякуючы канкардату вучні каталіцкіх школ вызваленыя ад прадмету «Сексалогія і асновы сямейнага жыцця». Тыя ж школы і іншыя інстытуты Касцёлу ў Славакіі не абкладаюцца падаткамі.

Усе пералічаныя аргументы супраць канкардатаў — аргументы еўрапейскіх атэістаў і левых. З улікам асаблівасці беларускай сітуацыі, думаецца, што ў нас наўрад ці грамадства зверне асаблівую ўвагу на аспекты прававой працэдуры прыняцця канкардату або яго адпаведнасці дзеючай Канстытуцыі. Той фармат палемікі, якую навязваюць праваслаўныя арганізацыі, ставіць у цэнтр дэбатаў геапалітыку, пытанне цывілізацыйнага выбару беларусаў.

**У краінах, якія маюць канкардаты, часам існуюць цэлыя грамадска-палітычныя рухі, якія патрабуюць адмены канкардатаў або рэвізіі іх зместу**

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ПАТРЫСІЯ ЭСПІНОЗА



52-гадовы міністр замежных спраў Мексікі праславілася на ўвесь свет дзякуючы сваёй ролі ў перамовах наконт новай рэдакцыі Кіёцкага пратакола. Перамовы ў рамках кліматычнай канвенцыі ААН адбываліся на працягу апошніх двух тыдняў у Канкуне (Мексіка). Напярэдадні мерапрыемства прагнозы адносна яго вынікаў былі самыя песімістычныя. Год таму краіны першага і трэцяга свету моцна перасварыліся паміж сабой на аналагічнай канферэнцыі ў Капенгагене і шукаць кампраміс быццам не збіраліся. Шматлікія аналітыкі сцвярджалі, што ўжо сам факт захавання пляцоўкі для працягу дыялогу будзе вялікім поспехам для Канкуну. Але Патрысія дабілася большага, а менавіта падпісання дамовы, якая зноў вяртае кліматычныя перамовы ў канструктыўны накірунак. Усе дэлегаты пагадзіліся з тым, што існуе пагроза планеце і на наступнай канферэнцыі ў Дурбане (Паўднёвая Афрыка) трэба нешта вырашаць. «Я мяркую, што нам удалося стварыць архітэктуру сістэмы абароны клімату на бліжэйшы час», — кажа Патрысія. Незадаволенымі ад вынікаў сустрэчы ў Канкуне засталіся выключна дэлегаты з Балівіі. Як вядома, увесну ў Балівіі адбыўся так званы народны кліматычны форум, удзельнікі якога (галоўным чынам левакі) паспрабавалі перахапіць у ААН ініцыятыву.

### ВОЛЬФГАН КУБІКІ



Шэф нямецкай ліберальнай Партыі свабодных дэмакратаў (FDP) у зямлі Шлезвіг-Гальштэйн узначаліў бунт супраць партыйнага кіраўніцтва ў асобе старшыні Гіда Вестэрвеле. Кубікі публічна параўнаў цяперашнюю FDP, якая, дарэчы, фармуе разам з хрысціянскімі дэмакратамі ўрад ФРГ, з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай (ГДР) на фазе яе развалу, а ў дадатак назваў Гіда галоўным адказным за такі сцэнар падзей. FDP сапраўды перажывае не лепшыя часы. Як партыя ліберальных поглядаў, яна аказалася незразумелай шмат каму ў часы эканамічнай рэцэсіі, калі, наадварот, запатрабаваны ўрадавы кантроль над эканомікай. Рэйтынг партыі за пару гадоў зменшыўся з 14 працэнтаў да 4–5, а колькасць сяброў скарачаецца хуткімі тэмпамі. Кубікі прагназуе поўны развал партыі ў выпадку правалу на бліжэйшых зямельных выбарах. Пры гэтым сам Вольфганг упарта лічыць, што праблемы партыі — у канкрэтных асобах, якія, па яго словах, «няздольныя прааналізаваць працэсы на месцах». На закуску Кубікі заклікаў Вестэрвеле пайсці ў адстаўку.

### ЛЕАНІД ГРАЧ

Харызматычнага лідэра крымскіх камуністаў, былога кіраўніка Аўтаномнай Рэспублікі Крым вызвалілі з пасады першага сакратара Крымскага рэспубліканскага камітэта партыі. Такое рашэнне прыняў Пленум Кампартыі Украіны (КПУ). Больш таго, палітыка вывелі з ЦК КПУ. Прычынай звальнення паслужылі, як адзначаецца ў заяве КПУ, «сур'ёзныя парушэнні партыйнай дысцыпліны і ўчынкі, накіраваныя на дыскрэдытацыю партыі». Цяжка зразумець, пра якія «сур'ёзныя парушэнні» ідзе гаворка. Прэса ў пошуках адказу называе два фактары. Па-першае, Грач і цяперашні лідар КПУ Пётр Сіманенка даўно ўжо пасварыліся. Самым вядомым прыкладам была заява Леаніда Грача наконт маральнага вобліку Сіманенкі пасля таго, як той завёў сабе маладую каханку. Дарэчы, экс-супруга Сіманенкі перад тым, як на публіцы заявіць пра тое, што яе муж — здраднік, парадзілася з Грачом. Па-другое, прычынай магла стаць апошняя выбарчая кампанія камуністаў у Крыму, якая будавалася на крытыцы Партыі рэгіёнаў. Леанід Грач нават назваў партыю Януковіча «фашыстамі». Між тым, КПУ ўваходзіць у кабінет Міколы Азарава (Партыя рэгіёнаў). Так ці інакш, Грач — настолькі вядомая асоба, што ён наўрад ці так проста пойдзе з палітыкі. Палітолагі прагназуюць стварэнне пад яго патранажам як мінімум асобнай крымскай левай партыі. Магчыма, Грач таксама паспрабуе зрабіць новы левы партыйны праект на нацыянальным узроўні.



СПАДЧЫНА

# МІНКУЛЬТУРЫ СУПРАЦЬ РПЦ

**Міністэрства культуры просіць Генпракуратуру распачаць крымінальную справу ў сувязі са зменамі аўтэнтычнага выгляду помніка архітэктуры барока XVII стагоддзя — будынка былога Благавешчанскага касцёла пры кляштары дамініканцаў, які знаходзіцца ва ўласнасці праваслаўнага прыходу храма Уваскрэсення Хрыста ў Клецку (Мінская вобласць).**

Пра гэта гаворыцца ў лісце намесніка міністра культуры Віктара Кураша старшыні Беларускага добраахвотнага таварыства ахове помнікаў гісторыі і культуры Антону Астаповічу.

Намеснік міністра паведамляе, што пракурор Клецкага раёна адмяніў пастанову Клецкага РАУС аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы ў дачыненні да парушальнікаў заканадаўства пры перабудове помніка і накіраваў матэрыялы ў Клецкі РАУС для дадатковай праверкі.

Як адзначаецца ў лісце, на сакавік 2011 года Мінкультуры запланавала праверку выканання заканадаўства па ахове спадчыны з боку РКУП «Клецкая ЖКГ».

19 лістапада Астаповіч звярнуўся да міністра культуры Паўла Латушкі з просьбай правесці ў Клецкім раёне праверку выканання заканадаўства ў сферы аховы спадчыны.

У лісце да міністра Астаповіч паведамляў, што па ініцыятыве настаяцеля храма Уваскрэсення Хрыста ўсталяваныя купалы-цыбуліны на будынку Благавешчанскага касцёла.

Паколькі будынак касцёла з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю міжнароднага значэння, любыя несанкцыянаваныя працы, якія прывялі да змены аўтэнтычнага выгляду помніка, парушаюць шэраг артыкулаў закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», а таксама іншыя нарматыўна-прававыя акты краіны, гаварылася ў лісце.

Яго аўтар паведамляў, што яшчэ восенню 2008 года прыход храма Уваскрэсення Хрыста і Клецкі райвыканкам неаднаразова папярэджваліся з боку таварыства, Мінаблвыканкама і Міністэрства культуры пра недапушчальнасць правядзення несанкцыянаваных прац. Нягледзячы на ўсе пісьмовыя папярэджанні і рашэнне Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны пры Мінкультуры ад 26 лістапада 2008 года, «адбыліся навукова неабгрунтаваныя змены вонкавага выгляду помніка пры бяздзейнасці і нават маўклівай падтрымцы адказных супрацоўнікаў Клецкага райвыканкама», падкрэслівалася ў лісце.

У той час, як Мінкульт бароніць адну гістарычную спадчыну, іншую ён гатовы кінуць у ахвяру.

Разгледзеўшы зварот працiўнікаў будаўніцтва офіснага будынка ў гістарычным цэнтры Магілёва, міністэрства ў асобе намесніка міністра Віктара Кураша прыйшло да высновы аб магчымасці ўзвядзення такой пабудовы.

У раёне перасячэння вуліц Першамайскай і Лазарэнкі абласнога цэнтра холдынг «Сервалюкс» — недзяржаўны трэйдар і вытворца сельгаспрадукцыі — плануе ўзвесці офісны будынак. Аднак прыхільнікі аднаўлення і захавання гістарычнай спадчыны Магілёва мяркуюць, што на гэтым месцы неабходна рэканструяваць будынак езуіцкага касцёла Святога Ксаверыя, фундамент якога захаваўся.

У канцы лістапада магілёўскае аддзяленне грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» (ТБМ) накіравала пісьмовы запыт у Міністэрства культуры з просьбай перагледзець прынятае рашэнне аб дазволе на правядзенне навукова-даследчых і праектных работ «Сервалюксам».

Згодна з адказам з Мінкульта, зараз немагчыма аднавіць архітэктурны ансамбль езуіцкага касцёла на месцы яго былога знаходжання.

У міністэрстве зазначаюць, што, згодна з законам аб захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, неабходна ўзгадняць навукова-праектную дакументацыю на выкананне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях. «Замоўца работ на будаўніцтва адміністрацыйнага будынка падчас грамадскага абмеркавання забудовы гістарычнага цэнтра Магілёва пацвердзіў сваю зацікаўленасць у безумоўным выкананні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», — згадваецца ў лісце.

Старшыня магілёўскай арганізацыі ТБМ Алег Дзячкоў заявіў БелаПАН, што яго «вельмі здзіўляе» такі адказ Мінкультуры. Паводле яго слоў, ТБМ і далей будзе адстойваць сваю пазіцыю аб мэтазгоднасці аднаўлення будынка касцёла.

**Паводле БелаПАН**

ТЭАТР

# СОНЕЧКА Ў СТУПАРЫ

**Андрэй РАСІНСКІ**

**У тэатры Беларускай драматургіі адбылася прэм'ера «Сонечкі», пастаўленай паводле «Злачынства і пакарання» Фёдара Дастаеўскага. П'еса-інсцэніроўка Алены Паповай — няўцямна-экзальтаваная нарэзка, якую не ратуюць акцёры і рэжысёр.**



Калі тэатр не ведае, куды рухацца, то звяртаецца да надзейных літаратурных крыніцаў. Класікі, правераныя часам, выратоўваюць, даюць апору, падказваюць. Адзін з самых шаноўных аўтараў, якому, прынамсі, пашанцавала з экранізацыямі — Фёдар Дастаеўскі. А «Злачынства і пакаранне» — ягоны хрэстаматыйны твор. Гэта дазваляе публіцы пачувацца дасведчанай — і абяцае хаця б нейкую зычлівасць.

На сцэне — шэры турэмны закуток. Рука марудна прыадчыняе засаўкі закратаваных дзвярэй. Адны дзверы, другія, трэція. На авансцэне — Раскольнікаў. Спакутаваныя вочы. Маналог пра неабходнасць забойства няшчаснай старой-працэнтніцы. Кідаецца з сякерай за дзверы.

Істэрычны лямант і крыкі. Чырвонае святло. На сцэне скачуць здані ў чорным — у чырвоных пальчатках. «Забілі! Забілі! Старую забілі!»

Чырвоны колер — крыві — вандруе ад героя і да героя. Спачатку — д'яблы ў пальчатках «па локаць у крыві». Потым чырвоная хустка — смяротна хворай і ашалелай Кацярыны Іванаўны (Людміла Сідаркевіч). У фінале — зноў шпэць з пальчаткамі.

Над «турэмнай» сцэнай — балкон, дзе Раскольнікаў сустракае п'янага Мармеладава, ягоную дачку Сонечку — усю ў белым, дый іншых герояў.

Персанажы часта спускаюцца ў закратаваны закуток. Б'юцца і б'юцца ў гэтым закутку. Паміраюць. Носяцца здані са шпітальным сталом на колах. Гаворыць і гаворыць Сонечка. Крычыць і ніякавее Раскольнікаў.

Дастаеўскі — рэаліст чалавечых душаў. Праз жыццё людзей — у канкрэтных абставінах — ён раскрывае бездані пекла і раю. Пастаноўка па Дастаеўскаму дазваляе альбо кінуцца ў замагільны карнавал з неверагоднай сцэнічнай механікай, альбо аскетычна засяродзіцца на рухах чалавечай душы, дзе тэатральная машынэрыя зведзеная да мінімуму.

Тэатр заўжды — альбо празмерны, шыкоўны, дэкарацыйны, альбо сціплы. Тэатр шыкоўны патурае фантазіям дый ілюзіям, пестуе вока. Такі тэатр — падкрэсленая ўмоўнасць, што красуецца ў святле рампы і пацяшае аўдыторыю. Іншы тэатр — сціплы, камерны, інтымны, ён гаворыць з гледачом шэптам, тут і цяпер, у непасрэднай прысутнасці.

Абодва тэатры — два бакі аднаго мастацтва. Але тэатр шэпту альбо тэатр вачэй мусяць быць дакладна акрэсленыя.

У «Сонечцы» намешана ўсяго — без усялякага стылю і пэўнасці.

Шэпт-споведзь з'ядаецца, харэаграфічная празмернасць зашэптваецца.

Беларуская мова дыялогаў змяняецца аўтарскімі зацемкамі на рускай мове ад Фёдара Міхайлавіча — каб мы не заблыталіся, што з кім і пасля чаго адбываецца.

Героі не паспяваюць паскандаліць (а якія ў Дастаеўскага скандалы!), як сцэны абрываюцца. Раскольнікаў толькі раскрыў рот, як валіцца на падлогу. Сонечка расплюшчыла вочы — але здзіўляцца ёй давялося толькі ў наступнай сцэне (калі дадуць). Дакараць сумленных акцёраў — Андрэя Бібікава і Надзею Цвяткову — за гэта нельга; такія правілы гульні, дакладней, яе адсутнасці.

Няшчасныя героі знаходзяцца пераважна ў двух станах — экстатычнага ступару ці непрытомнасці. Маці Раскольнікава (Ганна Маслоўская) знямела ад жаху; яе сынок як бярвенне, сястра (Анастасія Баброва) аслупянела.

Але на сцэне доўга дранцвець немагчыма — і тады з-за дзвярэй-кратаў вылятаюць «здані» ў чорных хламідах дый таньчаць свой «данс макабр», абачліва падгледжаны на «Хэлаўіне» п'яных студэнтаў.

Часам гэтыя навязлівыя скокі становяцца настолькі кепскімі, што аж но хораша. Асабліва дзікай выглядае сцэна памінак па Мармеладаву (Андрэй Дабравольскі, якога вывезлі са сцэны на шпітальным стале).

Гучаць абсалютная шальныя зонгі ад Мюра Фарыдовіча. (Зонгі, адкуль гэта — няўжо ад Брэхта? Але гэта зусім іншы тэатр — не містычнае прадстаўленне і не «аСтаніслаўлены» побыт! Дык у мяшанку спектакля ўсё пойдзе!)

Дурныя спевы пра нейкіх палякаў (гэта трэба пачуць!), крыкі Амаліі Іванаўны (харызматычна-яскравая Галіна Чарнабаева) — але што, да чаго, куды?

Безгустоўна-кашмарны карнавал, мо' і намякае на «карнавальнасць» творчасці Дастаеўскага, але такія грунтоўныя намёкі яўна не былі мэтай інсцэніроўкі.

У спектаклі ёсць толькі тры сцэны, якія хоць неяк чапляюць. Гэта сцэна з Лужыным і лебезятнікавым (Дзмітрый Мядзведзеў і Кірыл Навіцкі) — але толькі таму, што тут маецца ўцямная драматургія (і гэта Дастаеўскі!). Сцэна са Свідрыгайлавым — але толькі таму, што яго эфектнаравіста, з лёгкім пазёрствам, сыграў сам рэжысёр Ігар Сігаў.

Нарэшце, галоўная сцэна — калі Сонечка чытае Евангелле (а Раскольнікаў дэманстратыўна валяецца на шпітальным стале). Але Добрую Вестку нельга сапсаваць ніякай тэатральнай інсцэніроўкай.

Асноўная праблема спектакля — неахайная п'еса Алены Паповай, якая нарэзала Дастаеўскага так, што нават людзі, якія памятаюць «Злачынства і пакаранне», з цяжкасцю здагадаюцца пра сюжэт. Пра забойства старой яшчэ ўцяміць можна (калі ведаць кнігу). Але хто з кім канфліктуе? Чаму? Якія гэта выклікае пачуцці ў персанажаў? Што героі гавораць адзін аднаму дый гледачу? І навошта?

Рэжысёр Ігар Сігаў і пастаноўшчык Валеры Анісенка старанна імкнуцца заткнуць драматургічныя дзіркі хоць нейкім дзеяннем. Але калі п'еса не атрымалася, то нават самы таленавіты рэжысёр не выратуе яе.

Але ёсць яшчэ адна цяжкасць.

Сёння мы маем крызіс савецкай тэатральнай школы. Творцы, узгадаваныя ў Савецкім Саюзе, прызвычаіліся да эзопавай мовы, якая дазваляла гаварыць пра веру і душу. Мова сімвалаў выстаўляла мастакоў праведнікамі забароненае духоўнасці.

Але сёння гаварыць можна ўсё. І старанна ўзгадаваная мова «дулі ў кішэнях» не ведае, як сказаць Добрую Вестку. Паныла-навязлівы сімвалізм ужо нікому і нічога не тлумачыць — а толькі тлуміць, маскуючы пустату.

Маецца і крызіс аўтара як такога. Сёння аўтар, які калісьці рамантычна бурапеніў, можа выступаць альбо стваральнікам масак — яскравых і жанравых, альбо ціхмяным апавядальнікам. Але і тое, і другое патрабуе ад яго адысці ўбок, не лезці наперад, быць сціплым і стрыманым.

Час тэатральных дэміургаў, якія эксперыментавалі з гледачом, прайшоў. Час, калі інтэлігенцыя гаварыла народу пра забароненае, мінуў.

А творцы ўсё яшчэ самотна стаяць на подыуме. Яны дасюль лічаць сябе цэнтрам і крыніцай духоўнасці. Яны дасюль спадзяюцца на праведнасць.

Вельмі наіўная і дзіцячая пыха. Асабліва, калі сапраўдная Добрая Вестка ўжо прагучала.

СПАДЧЫНА

# ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ БЕЛАРУСІ

## КРЫЖ РАСЦІСЛАВУ ЛАПІЦКАМУ

Таццяна УЛАСЕНКА

**Крыж Расціславу Лапіцкаму ўпершыню быў усталяваны ў верасні 2009 года ва ўрочышчы Чырвоны Беражок, што на Вілейшчыне. Раней тут быў памятны валун з надпісам: «У гэтым месцы расстраляны Расціслаў Лапіцкі (I.IX.1928 — 28.X.1950), змагар за незалежнасць Беларусі». Помнік беларускаму герою быў асвечаны праваслаўным святаром з вёскі Касута, адкуль родам славуты падпольшчык.**



Памятны валун, які знеслі ўлады


Актывісты ўзводзяць крыж

Магутны камень моцна трымаўся на бетоннай падушцы металічным дротам, важыў некалькі тон, але ж не вытрымаў агрэсіі, паддаўся націску магутнай спецтэхнікі, якой вывезлі яго на сметнік па загаду мясцовых уладаў. Здарылася гэта напярэдадні святога дня памінання памерлых — Радаўніцы.

«Расціслаў Лапіцкі — знакавая для Беларусі фігура, — кажа старшыня Вілейскай суполкі Партыі БНФ, рэдактар гістарычнага часопіса «Волат» Аляксей Сюдак. — У 1948 годзе ён стаў арганізатарам і кіраўніком антыкамуністычнага моладзевага руху на Мядзельшчыне і Смаргоншчыне. Сябры руху друкавалі і распаўсюджвалі ўлёткі, у якіх заклікалі змагацца са сталінскім рэжымам, выказвалі пратэст супраць антынароднай паліты, якая характарызавалася вялікімі падаткамі, калгасным прымусам, рабаўніцтвам цэркваў, закрыццём беларускамоўных школ і русіфікацыяй насельніцтва. У 1950 годзе моладзевая арганізацыя была выкрытая савецкімі спецслужбамі, а ўсіх яе ўдзельнікаў саслалі ў лагеры. Расціслава Лапіцкага разам з паплечнікам Факундам Несцяровічам асудзілі на смяротнае пакаранне. Расціслава расстралялі ва ўрочышчы Красны Беражок ля Вілейкі. Было яму ўсяго 22 гады. Да гэтага часу ён не рэабілітаваны. Безумоўна, такіх мужных маладых асобаў, як Лапіцкі, было шмат на Беларусі. І кожнаму з іх павінны быць усталяваныя памятныя знакі».

Заканамерным крокам беларускай грамадскасці ў процідзеянне вандалізму мясцовых уладаў стала ўзвядзенне крыжа на месцы знесенага валуна Лапіцкаму. Адбылося гэта 1 верасня 2009 года, на дзень нараджэння нацыянальнага героя.

Побач знаходзіўся яшчэ адзін крыж — «Ахвярам рэпрэсіяў ад грамадскасці Смаргоні», які сімвалічна ўшаноўваў памяць усіх змагароў за незалежнасць Беларусі, забітых расійскімі, польскімі, нацысцкімі, савецкімі карнікамі, месцы пахаванняў якіх не вядомыя родным і блізкім ахвяраў. Завяршыў народны мемарыял трэці крыж, з надпісам «Героям Беларусі», усталяваны 9 верасня 2009 года.

10 верасня ўсе тры крыжы былі знесены, традыцыйна, па загаду мясцовых уладаў. А вілейскія актывісты Аляксей Сюдак, Уладзімір Малярчук і Аляксандр Наркевіч, якія ўдзельнічалі ва ўсталяванні народнага мемарыялу, былі абвінавачаны ў правядзенні несанкцыянаванага мітынгу. Мітынгам праваахоўныя органы палічылі ўскладанне кветак ды ўрачыстыя прамовы ўдзельнікаў мерапрыемства па ўшанаванні памяці беларускіх герояў. Тады ім прысудзілі ад 20 да 30 базавых велічынь.

«Так карэктуецца маральнаэтычнае, рэлігійнае выхаванне беларусаў сённяшнімі ўладамі, знішчаецца гістарычная памяць, — каментуе Аляксей Сюдак. — Але не ўсе пагаджаюцца з навязанымі грамадству правіламі. Дзякуючы розгласу гэтай справы ўсё больш людзей стала цікавіцца асобай Расціслава Лапіцкага, маўляў, што ж за чалавек такі быў, калі месца расправы над ім нельга абазначыць сімвалічным помнікам. Крыжы мы зноў аднавілі. І зараз да гэтага месца прыходзяць не толькі грамадскія актывісты, але і тутэйшыя, жыхары з навакольных мястэчак. Маладыя з Вілейшчыны падчас вяселля ўскладалі тут кветкі і запальвалі зьнічкі».

Сёння асоба беларускага змагара ўвекавечана не толькі народным мемарыялам, але і надрукаванымі кнігамі. У вытоках скрупулёзнай працы па даследаванні жыцця і дзейнасці Расціслава Лапіцкага стаіць вядомы беларускі навуковец, гісторык, археолаг Міхась Чарняўскі. Вынікам яго апантанай даследчыцкай працы з'явіліся дзве кнігі, прысвечаныя Мядзельска-смаргонскаму моладзеваму падполлю 1947–1950 гадоў і яго кіраўніку — «Як пошуг маланкі» і зборнік успамінаў і дакументаў «Не бойцеся ахвяраў і пакут». У гэтым годзе адбылася і прэзентацыя фільма па сцэнару М. Чарняўскага пад аднайменнай назвай кнігі «Як пошуг маланкі».

Нібыта лёс наканаваў нарадзіцца будучаму даследчыку ў той жа вёсцы, дзе жыў змагар, пайсці ў тую самую школу, у якой вучыўся і Расціслаў Лапіцкі. З пачуццём вялікай павагі і любові распавядае Чарняўскі пра свайго земляка. Мы даведваемся, што Лапіцкі быў не толькі моцнай і гераічнай асобай, але і вельмі таленавітым ад прыроды чалавекам. Ён добра маляваў, граў на розных музычных інструментах, цудоўна спяваў, цвёрдай суполкай трымалася каля яго моладзь.

У шматлікіх сваіх інтэрв'ю Міхась Чарняўскі неаднойчы распавядаў пра тое, як моцна паўплывала на яго жыццё асоба Расціслава Лапіцкага. Мусіць, таму ў жахлівую для Беларусі эпоху «застою» Чарняўскі ўваходзіў у лік беларускіх дысідэнтаў, за сваю дзейнасць пераследаваўся ўладамі, быў выкінуты з працы. Ён заўсёды займаў актыўную грамадскую пазіцыю, і як толькі ўзнікла магчымасць, быў сярод тых, хто ствараў Беларускі Народны Фронт і Беларускую сацыялдэмакратычную грамаду.


На месцы знесенага крыжа брата

Чарняўскі разам з іншымі прадстаўнікамі беларускіх суполак зрабілі шмат для таго, каб імёны змагароў не былі забытыя. Каб было куды прыехаць з Мінска старэнькай сястры Расціслава Лапіцкага і ўшанаваць яго памяць, ускласці кветкі. Крыж ва ўрочышчы Чырвоны Беражок для Алены Лапіцкай — сімвалічна і месца пакуты беларусаў і магіла роднага брата.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «НЯЗЛОМНЫ З НАЗАРЭТУ» — ПА-БЕЛАРУСКУ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**У Мінску адбылася прэзентацыя аповесці Рышарда Курыльчыка «Нязломны з Назарэту». У перакладзе Анатоля Бутэвіча кніга пабачыла свет і на беларускай мове.**

У Чырвоным касцёле, дзе 12 снежня прайшла прэзентацыя, усе прывезеныя кнігі разышліся за пару гадзін. Давялося ехаць за новай партыяй. Рышард Курыльчык і Анатоль Бутэвіч падпісвалі кнігі паўтары гадзіны. Увесь гэты час людзі стаялі да іх у чарзе.

«Я вельмі рэдка сустракаюся з чытачамі. Кніга павінна гаварыць за аўтара», — лічыць Рышард Курыльчык. Для беларусаў ён зрабіў выключэнне. І такая цікавасць да кнігі, як ён прызнаўся, стала для яго нечаканасцю. Дарэчы, аўтар мае повязь з беларускай зямлёй. Ён нарадзіўся ў 1945 годзе на Браслаўшчыне.

Аповесць польскага аўтара перакладзена на многія мовы. Па ёй у Польшчы знялі фільм. У Мінску яна выйшла ў прыватным выдавецтве «Кавалер» накладам тысячу асобнікаў.

«Ён выдатны пісьменнік гістарычнай тэматыкі, — распавёў пра аўтара Анатоль Бутэвіч. — Яго называюць апошнім з магікан гістарычнай прозы ў Польшчы. Ён піша пра тое, што адбывалася вельмі даўно. Але піша так займальна і захапляльна, што чытаецца, як быццам гэты чалавек быў сведкам тых падзей. Бо ён здольны на падставе дакладных фактаў ствараць такі твор, які ўспрымаецца і як гістарычны, і як мастацкі».

«Гэта не рэлігійны тэкст. Гэта кніжка гістарычная», — падкрэсліў перакладчык. Рышард Курыльчык адзначыў, што вельмі доўга рыхтуецца да напісання кнігі. Збірае матэрыялы, вывучае навуковыя працы, жыццё людзей — усё, што датычыцца тых часоў. З размоваў з вернікамі ён зрабіў выснову, што нават яны вельмі мала ведаюць пра гісторыю рэлігіі. Таму што Ісус з'яўляецца для іх толькі Богам. «Яны не глядзяць на тое, што Ісус з'явіўся як чалавек, — сказаў Рышард Курыльчык. — Я хацеў паказаць складанасць той сітуацыі і тых часоў. Як ён мог жыць у час першага стагоддзя нашай эры».

Прадмову да кнігі напісаў доктар гістарычных навук, прафесар Віктар Фядосік. І адзначыў: «Аўтар аповесці літаратурна па драбінках сабраў вялікую колькасць гістарычных звестак пра грамадства, людзей, якія жылі ў Палесціне на пачатку І стагоддзя нашай эры... Вялікая заслуга аўтара — рэканструкцыя менавіта сапраўднай рэчаіснасці. ...Аўтар стварыў дакладныя характарыстыкі персанажаў свайго твора па гістарычных звестках. ...Многае можа ўспрымацца як нечаканае, неверагоднае, але аўтарская версія мае права на існаванне, бо яе галоўная апора — рэаліі тагачаснага жыцця».

Кніга складаецца з 12 раздзелаў, названых гадзінамі, якія апавядаюць пра зямное жыццё Хрыста. Дзесятая гадзіна — гэта ўкрыжаванне. «І калі я чытаў, мяне ўразіў перш за ўсё гэты тэкст. Я пачаў перакладаць менавіта з дзясятай гадзіны. А потым вярнуўся да ўсяго тэксту», — паведаміў Анатоль Бутэвіч.

Дванаццаты раздзел пакінуты пустым. «Я хацеў бы, каб чытач сам знайшоў выснову, — зазначыў Рышард Курыльчык. — Ён глядзіць на Бога, Сына Божага, Чалавека, які жыве ў той эпосе. Ён павінен сам адказаць сабе на пастаўленыя пытанні. Тое, у што я веру і як, гэта мая гісторыя, прыватныя пытанні і прыватныя адказы. Я нічога не хачу яму казаць».

▸ **IN MEMORIAN**

# НЕ СТАЛА ЛЭДЗІ БЕЛАРУСКАЙ РОК-МУЗЫКІ...

**Анатоль МЯЛЬГУЙ**

**Калі даводзілася гаварыць пра лёсы беларускіх рок-музыкантаў, то заўсёды радаваўся, што ўсе жывыя і здаровыя, ва ўсіх іх яшчэ шмат магчымасцяў зрабіць нешта важкае для беларускай культуры. Але на мінулым тыдні тое бесклапотнае пачуццё моцна пахіснулася, змянілася на роспач: заўчасна пайшла з жыцця вядомая беларуская рок-спявачка і журналістка Вольга Самусік...**



Вольга з сястрой



Вольга з гуртом BN

З Вольгай Самусік мне давялося пазнаёміцца спачатку завочна, як з ініцыятарам дыскусіі «Что есть она — музыка белорусская?» («Музыкальная газета» № 12, 2005). Тады пазіцыя журналісткі і некаторыя выказванні, якія былі зроблены Вольгай у палемічным запале, падаліся не зусім карэктнымі ў адносінах да ўдзельнікаў дыскусіі, да шляхоў развіцця айчыннай рок-культуры. Мне закарцела пазнаёміцца з Вольгай для ўдакладнення пазіцый. На жаль, спачатку такой магчымасці не выпадала: перашкаджалі неадкладныя справы і тое, што Вольга — маладая таленавітая журналістка — пачала выпрабоўваць сябе ў якасці вакалісткі ў беларускіх рок-гуртах. Мне нічога не заставалася, як зрабіць палеміку з думкамі Вольгі ў «Музыкальной газеце» пад рубрыкай «Что есть она — музыка белорусская?» цэнтральнай у маім музычна-культуралагічным эсэ «Музыка моўнага рэзістансу» («Дзеяслоў №22»).

Але наша знаёмства ўсё ж адбылося сам на сам. Гэта здарылася, калі В. Самусік рыхтавала інтэрв'ю з вядомым мінскім музыкантам Андрэем Плясанавым. Я зайшоў у госці да Андрэя і там, з ініцыятывы гаспадара, мы пазнаёміліся з Вольгай. Пару хвілін размовы хапіла, каб паразумецца і ўпэўніцца, што мы амаль аднадумцы ў пытаннях перспектыў айчыннай культуры...

Далей сустрэчы з Вольгай адбываліся на фестывальных пляцоўках па ўсёй Беларусі і за яе межамі. Так, напрыклад, упершыню я ўбачыў Вольгу Самусік у якасці салісткі гурта «Zygimont Vaza» на беларуска-ўкраінскім рок-фэсце «Bee Free» ў Львове. Сапраўдная ж вядомасць да Вольгі прыйшла пасля выбуховага выступлення гурта «Тарпач» на фестывалі «Рок-кола», які адбыўся ў Наваполацку ў 2007 годзе. Вольга Самусік у той час замяніла ў гурце Святлану Сугаку. Мне давялося быць у складзе журы і бачыць, як рэагавалі сябры журы на песні ў яе выкананні: гурт я яе вакалістку як адзін віталі самымі шчырымі апладысментамі і стоячы! Усе адзначалі тую ролю, якую ўнесла ў перамогу гурта «Тарпач» Вольга: яе магутны рок-вакал надаваў песням то рысы жаноцкай неабароненасці, то псіхадэлічнай вобразнасці, то станавіўся неабмежавана драйвавым і нават агрэсіўным.

Пасля ж абвяшчэння вынікаў «Рок-кола», на якім «Тарпач» быў узнагароджаны Гран-пры, шчаслівая Вольга выйшла да арганізатараў і журы фэсту. Дзяўчына была апранута ў канцэртную сукенку і пальчаткі, што надавала Вользе артыстычна-багемнага шарму. Яна яшчэ не адышла ад канцэртнага адрэналіну, але была ў гуморы і жартавала. Гэты настрой перадаваўся ўсім, хто ўдзельнічаў у пасляканэртнай сустрэчы. Тады я падумаў пра Вольгу: «Сапраўдная лэдзі беларускага року!»

Потым былі сустрэчы на канцэртах гурта «:B:N», узнагарода рок-каронай у намінацыі «Рок-князёўна» на «Рок-каранацыі–2007». Паўсюль Вольга ўкладвала ў песні часцінку свайго таленту, сваёй музычнай душы...

Трагічны лёс абарваў жыццё таленавітай спявачкі і журналісткі Вольгі Самусік. Але тое, што яна зрабіла для сучаснай беларускай культуры, не дазваляе гаварыць пра Вольгу ў мінулым часе. Думаю, што гурт «Тарпач» у цяперашнім яго складзе давядзе справу да выдання дыска з вакалам Вольгі, апублікуе яе відэа.

Выдатны талент, трагічны лёс. Бывайце, Вольга...




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1293

Падпісана да друку 17.12.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.